

ВЯСЁЛЫЯ ГІСТОРЫІ ЧЫТАЧОЎ 5

ШТО МОЖА ДЭПУТАТ? МС



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

29 ЧЭРВЕНЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 123 (28739)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ — ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерый КАВАЛЬКОЎ, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

*«Асноўная работа па прызначэнні пенсіі ляжыць на наймальніку. Менавіта ён абавязаны падрыхтаваць свайму работніку, будучаму пенсіянеру, поўны пакет усіх неабходных для гэтага дакументаў. Ад якасці гэтай работы залежыць хуткасць працэсу і правільнасць прызначэння пенсіі. Наймальнікі не ўсведамляюць паўнату адказнасці, якая на іх ускладзена заканадаўствам менавіта ў гэтым пытанні».*

## КОРАТКА

- Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 29 чэрвеня ў Мінску прыме ўдзел у мітынгу-рэквіеме, прысвечаным памяці ахвяр нацызму, на тэрыторыі былога лагера смерці «Трасцянец».
- **Беларусь і Украіна плануюць правесці дэмаркацыю мяжы да 2026 года.**
- Права мясцовых Саветаў дэпутатаў павышаць стаўкі маёмасных падаткаў плануецца абмежаваць.
- **Каля 700 беларускіх трактароў у 2017 годзе пастаўлена на літоўскі рынак.**
- Лёгкаатлетка Ірына Жук устанавіла рэкорд Беларусі ў скачках з шастом. На спаборніцтвах Meeting Pro Athle de Nancy ў французскім Нансі яна пераадолела планку на вышыні 4 м 66 см, атрымаўшы ўпэўненую перамогу.



- **У Любанскім раёне міліцыянеры знайшлі і знішчылі 1,5 га дзікарослых канопляў.**

ISSN 1990 - 763X

# УСМЕШЛІВАЕ ЛЕТА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Марыя і Міхаіл БУЛАЎКІ з Ліды жывуць разам ужо сорак гадоў. А ведаюць адно аднаго нашмат даўжэй — яны аднавяскоўцы і аднакласнікі. Што цікава: у сужэнцаў цёзкі не толькі бацькі Фёдары Міхайлавічы, але і дзяды — Міхаілы Аляксандравічы. Такая вось цікавая сямейная гісторыя, якую, напэўна, раскажуць свайму чатырохгадоваму ўнуку Івану, калі трохі падрасце. А пакуль яны разам запускаюць паветранага змея і радуюцца жыццю, лету і спраўджанай мары малога.**

■ Кампетэнтна

## КРЭДЫТЫ ЯШЧЭ ПАТАННЕЮЦЬ?

### Як зніжэнне стаўкі рэфінансавання паўплывае на эканоміку

**У краіне стаўка рэфінансавання знізілася з 10,5 % да 10 %. На яе памяншэнне строноўча ўплывае зніжэнне тэмпаў гадавой інфляцыі. Таксама варта адзначыць, што зніжэнне ключавога індыкатара адбываецца на фоне працяглага забеспячэння аб'ёмаў крэдытавання насельніцтва. Ці варта зніжаць кошт крэдытаў у такіх умовах? На думку эканамічнага аглядальніка Аляксея АЎДОНІНА, кантраляванае зніжэнне працэнтнай стаўкі па крэдытах павінна паспрыяць паскарэнню тэмпаў эканамічнага росту.**

### Паскорыць тэмпы росту

«Зніжэнне стаўкі рэфінансавання адпавядае заяўленым методыкам і механізмам, якія цяпер ужываюцца Нацбанкам. Яны закліканы рэгуляваць грашовую масу і працэнтную стаўку», — адзначыў эксперт.

На думку Аляксея Аўдоніна, казаць пра тое, што зніжэнне стаўкі рэфінансавання на фоне закрэдытаванасці насельніцтва можа негатыўна паўплываць на эканоміку, — не зусім правільна.

«Нізкая працэнтная стаўка арыентавана паскорыць тэмпы эканамічнага росту. Яна стымулюе рост унутранага попыту і фінансаванне даўгоў, якія былі набраныя і насельніцтвам, і прадпрыемствамі раней. Гаворка ідзе пра 2014—2015 гады, калі стаўкі былі дастаткова высокія. Гэта дазваляе знізіць пазыковую нагрузку і паскорыць тэмпы росту прадпрыемстваў, павялічвае аб'ёмы спажывання насельніцтва», — лічыць эксперт.

СТАР. 2

■ Падрабязнасці

## ІЗНОЎ ІДЗЕ ПАСАДКА НА БАРТЫ...

### Як пад Мінскам трэніруюцца лётчыкі




Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

**Святочны парад войскаў Мінскага гарнізона адбудзецца ў сталіцы на Дзень Незалежнасці. Пасля праходжання механізаванай калоны ў небе з'явіцца авіяцыя. Паветраны эшалон парада будзе прадстаўлены баявымі верталётамі Мі-8МТВ-5, Мі-24, знішчальнікамі МіГ-29, штурмавікамі Су-25, ваенна-транспартнымі самалётамі Іл-76, Ан-26, вучэбна-баявымі самалётамі Як-130 і вучэбна-трэніровачнымі самалётамі Л-39.**

СТАР. 4

■ Парламенцкі дзённік

# ПРАВІЛЫ ДЛЯ ЛІЧБЫ

## У Савеце Рэспублікі разгледзелі Дэкрэт № 8 «Аб развіцці лічбавай эканомікі»

**Дакумент у верхняй палаце, гэтак жа, як і раней у ніжняй, прадстаўляў першы намеснік прэм'ер-міністра Васіль Мацюшэўскі, які ўзначальваў рабочую групу распрацоўшчыкаў дэкрэта.**

«Лічбавы бізнес, як і ўся эканоміка ведаў, валодае адной асаблівасцю: тут няма сыравіны і матэрыялаў, не патрэбны зямля, абсталяванне і памяшканні. Ключавы элемент — чалавек, які стварае лічбавы прадукт. Яшчэ больш важны той, хто гэты прадукт прадае. Дык вось, поспех краіны залежыць ад таго, наколькі спадабаецца альбо не ў нашай краіне тым, хто ўмее ўсё гэта рабіць», — тлумачыў дакладчык сенатарам сутнасць дэкрэта.

Ён запэўніў парламентарыяў, што дакумент накіраваны не толькі на падтрымку прадуктовай мадэлі ў частцы ІТ, але і на стварэнне ўмоў для развіцця ўсёй сферы — своеасаблівага асяроддзя. «Самае галоўнае пытанне ў тым, дзе пасля стварэння прадукту яго творца пажадае размясціць сваю інтэлектуальную ўласнасць і свае капіталы — пасля продажу гэтага прадукту. А размясціць ён у той краіне, дзе будуць гарантаваныя бяспека, стабільнасць і надзейная абарона ад самавольства, канфіскацый, арыштаў, раптоўных перамен дзеючых правілаў гульні», — падкрэсліў дакладчык.

Калі наша краіна створыць такія ўмовы, яна атрымае галоўную карысць ад вытворчасці такіх лічбавых прадуктаў, упэўнены першы віцэ-прэм'ер. Таму ў гэтай сферы мы ўпершыню сутыкаемся з неабходнасцю па-іншаму выбудоўваць свае адносіны з бізнесам. На думку Васіля Мацюшэўскага, каб выйграць у сусветнай канкурэнтнай барацьбе за таленты, мы павінны разглядаць «лічбавы» дэкрэт у непарыўнай сувязі з наступным, значна больш маштабным крокам, які дакладна быў абазначаны ў Пасланні кіраўніка дзяржавы беларускаму народу і парламенту: ператварыць Беларусь у адну з самых прывабных мясцін у свеце для багатых, таленавітых і паспяховых людзей.

«І калі «лічбавы» дэкрэт справядліва назвалі рэвалюцыйным, то будучыя рашэнні аб ператварэнні Беларусі ў спрыяльнае месца для капіталу, у цывілізаваную, зручную і свабодную фінансавую гавань увогуле павінны стаць гістарычнымі. У выпадку іх прыняцця і «лічбавы» дэкрэт запрацуе ў сапраўдную і поўную моц», — паабяцаў Васіль Мацюшэўскі.

Усяго на ўчарашнім пасяджэнні сенатары разгледзелі 20 пытанняў, сярод якіх таксама былі праекты абноўленых законаў «Аб якасці і бяспецы харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў для жыцця і здароўя чалавека», «Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь», а таксама дапаўненні ў адміністрацыйны і банкаўскі кодэксы і ратыфікацыя пагаднення аб бязвізавым рэжыме паміж нашай краінай і КНР.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# КРЭДЫТЫ ЯШЧЭ ПАТАННЕЮЦЬ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ён таксама адзначыў што аналагічную палітыку праводзяць краіны ЕС, ЗША, Кітай, дзе стымулююць эканамічны рост за кошт унутранага спажывання.

### Гадавы мінімум інфляцыі

Перадумовы для зніжэння стаўкі рэфінансавання таксама ёсць. У Нацыянальным банку адзначаюць, у маі абноўлены гістарычны гадавы мінімум інфляцыі: прырост спажывецкіх цэн запаволіўся да 4,4 % у гадавым вымярэнні. Адносна красавіка ў маі спажывецкія цэны знізіліся на 0,3 %. Адбылося гэта ў першую чаргу за кошт запаволення росту цэн на плодаагародніннную прадукцыю, а таксама цэн, на якія не ўплывае сезонны фактар і адміністрацыйнае рэгуляванне.

Зніжэнне ключавога індыкатара павінна таксама ў найбліжэйшай перспектыве зменшыць кошт крэдытаў. Аднак, з пачатку года жыхары краіны ўжо набралі іх вялікую колькасць. Паводле статыстыкі рэгулятара, агульная запазычанасць фізічных асоб у краіне на 1 мая склала больш за 9,75 мільярда рублёў. Павелічэнне колькасці ўзятых крэдытаў расце на працягу пяці месяцаў. З пачатку года яна павялічылася на 718,5 мільёна рублёў (у студзені сума набраных крэдытаў складала 9031,9 мільёна рублёў).




Варта адзначыць, што каля траціны даўгоў складаюць крэдыты на спажывецкія патрэбы. Аб'ём іх з пачатку года вырас больш чым на 10 %.

### Крэдытны фільтр

Крэдытны бум, які пачаўся раней, у Нацыянальным банку з 1 мая сталі рэгуляваць за кошт уводу новых правілаў крэдытавання насельніцтва. Згодна з імі, выплаты па ўсіх даўгавых абавязацельствах грамадзяніна не павінны перавышаць 40 % ад яго сярэднямесячнага даходу. Гэтая мера павінна знізіць рызыку некантралюемага крэдытавання.

Разам з тым сярэдняя працэнтная стаўка для фізічных асоб па новых крэдытах банкаў у нацвалюце на тэрмін да 1 года ў маі склала 9,3 % (паменшылася за месяц на 0,3 %), на тэрмін больш за 1 год — 11,7 % (паменшылася за месяц на 0,2 %). Зніжэнне працэнтнай стаўкі на «кароткія грошы» ў маі паказвае гатоўнасць працягваць крэдытаваць насельніцтва, нягледзячы на ўжо рэкордныя сумы набраных крэдытаў.

### Здымаюць валюту з рахункаў

Цікавая сітуацыя адбываецца і на рынку ўкладаў. На 1 мая тэрміновыя валютныя дэпазіты фізічных асоб у банках краіны зменшыліся з пачатку года больш чым на 4 % і склалі 6,4 млрд долараў. Насельніцтва працягвала здымаць з рахункаў валюту з прычыны нізкай прыбытковасці.

Для даведкі: сярэдняя працэнтная стаўка ў замежнай валюце па новых банкаўскіх укладах для фізічных асоб на тэрмін да 1 года ў маі склала 0,6 % (павялічылася на 0,1 % за месяц), а больш за 1 год — 1,5 % (за месяц павялічылася на 0,2 %). Месячны рост сапраўды назіраецца, але ён усё яшчэ застаецца нязначны.

Што датычыцца сярэдняй працэнтнай стаўкі ў нацыянальнай валюце, то яна па новых банкаўскіх укладах для фізічных асоб на тэрмін да 1 года ў маі склала 8,1 % (павялічылася на 0,4 % за месяц), на тэрмін больш за 1 год — 11,1 % (знізілася за месяц на 0,2 %). За месяц адбыўся рост стаўкі на «кароткія грошы» і нязначнае падзенне на «доўгія».

Таксама вядома, што на 1 мая 70 % рынку тэрміновых валютных дэпазітаў фізічных асоб кантралявалі ўсяго тры банкі — Беларусбанк (46 %), Белаграпрамбанк (18,2 %) і БПС-Ашчадбанк (5,8 %). Астатнія банкі абслугоўвалі 30 % укладаў грамадзян.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

■ У тэму

## АБСЛУГОЎВАЦЬ УЖО ВЫДАДЗЕНЫЯ ДОЎГІЯ КРЭДЫТЫ СТАНЕ ЛЯГЧЭЙ

**Зусім нядаўна ўступіла ў сілу новая інструкцыя Нацыянальнага банка аб парадку выдачы крэдытаў, якая ўводзіць новыя паняцці і нормы на крэдытным рынку.**

Цалкам верагодна, што з уступленнем у сілу новай працэнтнай стаўкі рэгулятара, камерцыйныя банкі пойдуць на змякчэнне крэдытных праваноў. Але, як правіла, банкі загадзя закладваюць у свае крэдытныя партфелі змяненне стаўкі Нацбанка. Таму малаверагодна, што зніжэнне ставак па новых крэдытах будзе настолькі значным, што прывядзе да выбуховага росту спажывецкага крэдытавання. А вось абслугоўванне ўжо выдадзеных крэдытаў, якія прывязаны да стаўкі рэфінансавання, будзе аблегчана. Асабліва гэта датычыцца доўгіх крэдытаў на набыццё аўтамабіляў і нерухомасці.

У цэлым можна казаць, што рашэнне Нацбанка абгрунтаванае, узважанае і своечасовае, лічыць **фінансавы кансультант Teletrade Міхаіл ГРАЧОЎ.** Яно надасць дадатковы імпульс росту нацыянальнай эканомікі. Дапушчальна, што на наступным пасяджэнні рэгулятара ў верасні гэтага года мы ўбачым яшчэ адзін крок паніжэння працэнтнай стаўкі.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### СУСТРЭЧА ПУЦІНА І ТРАМПА ПРОЙДЗЕ Ў ХЕЛЬСІНКІ



Аб гэтым паведаміла прэс-служба Крамля. Адзначаецца, што лідары абмяркуюць «бягучы стан і перспектывы далейшага развіцця расійска-амерыканскіх адносін», а таксама актуальныя пытанні міжнароднага парадку дня. Як заявілі ў Белым доме, Пуцін і Трамп закрануць тэму двухбаковых стасункаў Расіі і ЗША, а таксама шэраг пытанняў нацыянальнай бяспекі. Гэта будзе першая поўнафарматная сустрэча лідараў дзвюх краін без прывязкі да самітаў.

### ВЫЗНАЧАНЫ НАЙБАГАЦЕЙШЫЯ СЕМ'І СВЕТУ

Нашчадкі заснавальніка сеткі супермаркетаў Walmart Сэма Уолтана валодаюць капіталам у 151,5 мільярда долараў, што з'яўляецца найбуйнейшым для прадстаўнікоў адной сям'і, падлічыў Bloomberg. Сумарныя актывы 25 найбагацейшых кланаў сучаснасці складаюць 1,1 трыльёна долараў. Капітал Уолтонаў не змяніўся нават пасля спаду ў пачатку года, калі акцыі рытэйлера ўпалі на 14 працэнтаў за некалькі дзён. На другім месцы браты Дэвід і Чарльз Кохі — заснавальнікі і саўладальнікі нафтахімічнай карпарацыі Koch Industies. Разам ім належыць 98,7 мільярда долараў. У пачатку чэрвеня 78-гадовы Дэвід Кох абвясціў аб сваім сыходзе з савета дырэктараў кампаніі з-за праблем са здароўем. Трэцяе месца занялі нашчадкі Фрэнка Марса — заснавальніка кампаніі Mars, якая вырабляе аднайменныя шакаладныя батончыкі і іншыя прадукты. Іх уласнасць ацэньваецца ў 89,7 мільярда долараў. Таксама ў дзясятку ўвайшлі тры бельгійскія сям'і, якія валодаюць піваварнай кампаніяй Anheuser-Busch InBev, нашчадкі заснавальніка моднага брэнда Hermes Цьеры Эрмеса, уладальнікі Chanel браты Ален і Джэрард Вертхаймеры, індыйскія ўладальнікі прамысловай групы Reliance Industries, сям'я Кванта, якой належыць BMW, сямейства Каргіл, якое валодае карпарацыяй Cargill Inc. і нямецкія гаспадары фармацэўтычнай кампаніі Boehringer Ingelheim. «Крыніцы гэтых багаццяў разнастайныя, а іх маштаб здзіўляе — гэта больш, чым рынкавая капіталізацыя Apple, усе дэпазіты Citigroup або ВУП Інданезіі», — заўважаюць аўтары рэйтынга.

### МЕРКЕЛЬ НАЗВАЛА МІГРАЦЫЙНАЕ ПЫТАННЕ ЛЁСАВЫЗНАЧАЛЬНЫМ ДЛЯ ЕС



Канцлер ФРГ Ангела Меркель заявіла на пасяджэнні парламента, што лёс Еўрапейскага саюза вырашае яго здольнасць адказаць на выклікі, якія перад ім ставіць міграцыя, паведамляе Reuters. Яна таксама сказала, што па меры змяншэння колькасці мігрантаў будуць вернутыя ранейшыя міграцыйныя правілы, якія дзейнічалі да 2015 года. Адзначаецца, што Меркель абараняла сваю пазіцыю па міграцыйных пытаннях, у адпаведнасці з якім мільёнам мігрантаў было дадзена прыстанішча на тэрыторыі краіны. «Перад Еўропай стаіць шмат выклікаў, але менавіта міграцыйнае пытанне з'яўляецца для Еўрапейскага саюза лёсавызначальным», — падсумавала Меркель. Паводле яе слоў, ЕС павінен справіцца з гэтай праблемай, каб у Афрыцы перакаталіся ў еўрапейскіх каштоўнасцях, інакш ніхто больш не паверыць у тую самую сістэму каштоўнасцяў, якая зрабіла нас моцнымі».

## Выслухаюць і дапамогуць

**У суботу ў абласцях пройдуць традыцыйныя прамыя лініі.**
**30 чэрвеня з 9.00 да 12.00 на сувязі будуць:**

* старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ, тэл. 80162213121;

* старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ, тэл. 80212222222;

* намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ, тэл. 80232331237;

* кіраўнік спраў Гродзенскага аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ, тэл. 80152735644;

* кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН, тэл. 80222501869;

* намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Віктар Іванавіч СІРЭНКА, тэл. 80175004160;

* намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Віктар Сяргеевіч ЛАПЦЕЎ, тэл. 80172224444.

■ Будзь у курсе!

## На святы — 37 дадатковых цягнікоў

У перыяд з 29 чэрвеня і да 4 ліпеня па напрамку Мінск—Гомель прызначана 15 цягнікоў, Мінск—Брэст — 11 цягнікоў, Мінск—Віцебск — два цягнікі. Па напрамку Камунары—Мінск — адзін цягнік, Мазыр—Мінск—Мазыр (станцыя Козенкі) — два цягнікі. Таксама прызначана шэсць дадатковых цягнікоў міжнародных ліній у зносінах Мінск—Львоў і Мінск—Вільнюс.

Чатыры дадатковыя цягнікі № 635/461/462 і № 461/462 у зносінах Мінск—Львоў—Мінск будуць курсіраваць праз Баранавічы-Палескія, Лунінец, Удрыцк, Сарны, Роўна, Здалбунаў у перыяд з 29 чэрвеня да 3 ліпеня.

3 ліпеня магістраль прызначыла два дадатковыя цягнікі міжнародных ліній №801/802 Мінск—Вільнюс.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ На слыху

# У ФЕДЭРАЦЫІ ХАКЕЯ ЗМЯНІЎСЯ СТАРШЫНЯ

**Учора ў Федэрацыі хакея Беларусі адбылася справаздачная канферэнцыя, на якой падвялі вынікі работы ў сезоне 2017/2018 і яшчэ раз абмеркавалі пытанні фінансавання, сітуацыю з развіццём дзіцячага хакея і з'яўленне новых клубаў у краіне.**

Пасля сёлетняга чэмпіянату свету, па выніках якога беларуская зборная пакінула элітны дывізіён, стала зразумела, што ў нашым хакеі надышлі цяжкія часы. Раней «разбор» сітуацыі прайшоў ужо ў Міністэрстве спорту і турызму, а справаздачная канферэнцыя федэрацыі з пачатку чэрвеня была перанесена на канец месяца. На нарадзе, дзе сабраліся практычна ўсе спецыялісты галіны, трэнеры і менеджары зрабілі справаздачу аб праведзенай рабоце.

Мабыць, даклад **Сямёна ШАПІРЫ**, які займаў пасаду старшыні федэрацыі з мінулага года, заняў больш за ўсё часу. Ён адзначыў, што цяпер сапраўды склалася няпростая сітуацыя ў хакеі, прынята дастаткова шмат новаўвядзенняў, зменены фармат чэмпіянату і вырашаны многія фінансавыя пытанні. Як заўважыў Сямён Барысавіч, многія адзначаюць той факт, што праблемы крыюцца ў падрыхтоўцы маладых хакеістаў, таму федэрацыяй зроблены канкрэтныя крокі па рашэнні гэтых нюансаў. *«Калі год назад мы набіралі ў дзіцячыя секцыі па 500—600 хлопцаў, то сёлета колькасць павялічылася да 1900, а ў далейшым будзе яшчэ больш. Мы ўзяліся за адукацыю трэнераў, якія працуюць з дзецьмі, іх веды праверацца, маладых спецыялістаў адпраўляем на розныя навучальныя курсы, каб павысіць прафесіяналізм. Падрыхтавана новая вучэбная праграма для хакейных школ».* Сямён Шапіра адзначыў, што па даручэнні Прэзідэнта ў краіне было створана чатыры новыя клубы, але, на жаль, сёння ў іх яшчэ ўзнікае маса праблем, гэта датычыцца і Оршы, і Пінска, і Баранавіч. У завяршэнні свайго даклада Сямён Барысавіч перайшоў да вынікаў зборных краіны і падкрэсліў, што ні выступленне маладзёжнай зборнай (U-20), ні нацыянальнай каманды нельга назваць здавальняючым і паспяховым. *«Галоўным трэнерам на кантракце ў нас працаваў Дэйв Льюіс, яшчэ Ігар Рачкоўскі казаў мне пра свае асцярогі з нагоды трэнерскага штаба. У мяне з Льюісам была далёка не адна размова, і яны былі не асабліва прыемныя, таму што мне хацелася, каб ён праводзіў у Беларусі больш часу, усё ж такі гэта мелася на ўвазе яго работа. Ведаў, што яго рэдкае наведванне нашай краіны можа дрэнна паўплываць на выніку зборнай, але перарваць кантракт не адважыўся, хоць, магчыма, гэта трэба было зрабіць. Што адбылося з беларускай камандай, усе бачылі самі. Я, як кіраўнік федэрацыі, таксама ў гэтым вінаваты, прызнаю, што не справіўся са сваімі задачамі і таму падаю ў адстаўку»,* — сказаў на заканчэнне Сямён Шапіра. — *Усё ўзважыў і ацаніў, гэта рашэнне не было лёгкім. Любы чалавек, мужык, павінен глядзець праўдзе ў вочы».*

Сямён Барысавіч падзякаваў усім за працу і выказаў пажаданне, каб яго пост заняў чалавек з хакея, якому пажадаў выправіць усе дапушчаныя памылкі і хутчэй вярнуць беларускую зборную ў сусветную эліту гэтага віду спорту.

Адзіным кандыдатам на вызваленую пасаду стаў Генадзь Савілаў, у мінулым вядомы айчынны хакеіст, двухразовы чэмпіён Беларусі, трохразовы сярэбраны і трохразовы бронзавы прызёр, удзельнік чэмпіянату свету 2003 года ў складзе нацыянальнай зборнай Беларусі (6 матчаў). 42-гадовы спецыяліст выступаў за мінскія «Цівалі», «Юнацтва», «Керамін», «Дынама», жлобінскія «Белсталь» і «Металург», маскоўскі ЦСКА, магілёўскае «Хімвалакно» і «Гомель». Завяршыў сваю прафесійную гульнявую кар'еру 10 гадоў таму, а цяпер уваходзіць у склад хакейнай каманды Прэзідэнта Беларусі.

**«Праблемы крыюцца ў падрыхтоўцы маладых хакеістаў, таму федэрацыяй зроблены канкрэтныя крокі па рашэнні гэтых нюансаў».**

Новы кіраўнік федэрацыі адзначыў, што часу на развазрушванне няма, бо да наступнага чэмпіянату свету засталося ўсяго каля 11 месяцаў. *«За апошні год у бок федэрацыі было шмат крытыкі, для мяне гэта знак, што мы рухаемся ў правільным кірунку. Не чакайце ніякіх рэвалюцыйных рашэнняў, усё будзе рухацца паступова і планамерна. За апошнія 10 гадоў у Беларусі не з'явілася ніводнага хакеіста сусветнага ўзроўню, а раней у нас іх было каля 20, вось гэта сапраўдная праблема. Першачарговай задачай у нас будзе стаць вярнанне ў элітны дывізіён, адбор на Алімпійскія гульні і, вядома, нам неабходна паказаць годную гульню на чэмпіянаце свету, які прыме Мінск у 2021 годзе».*

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

■ Цэнтралізаванае тэсціраванне — 2018

# ХТО ЗМОЖА СКАРЫСТАЦЦА РЭЗЕРВОВЫМ ДНЁМ?

**11 чалавек атрымаюць сёлета па выніках ЦТ па грамадазнаўстве 100-бальныя сертыфікаты. У папярэднім годзе стабальнікаў па гэтай дысцыпліне было 16. Нуль балаў за тэст набралі 15 абітурыентаў. А сярэдні бал удзельнікаў ЦТ па грамадазнаўстве склаў 43,73 (у 2017 годзе — 41,76).**




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Наступнымі павінны абвясціць вынікі ЦТ па матэматыцы. А 30 чэрвеня распачнецца рэгістрацыя абітурыентаў на рэзервовы дзень. Арганізатары ЦТ папярэджваюць: да здачы тэставых іспытаў у рэзервовы дзень будуць дапушчаны толькі тыя абітурыенты, якія змогуць даказаць, што ў іх былі сур'ёзныя прычыны для пропуску экзамену, напрыклад, прад'явіць даведку пра сваю хваробу ці дакумент, які пацвярджае іх удзел у гэты момант у важных для краіны спартыўных ці творчых спаборніцтвах. Пры гэтым абавязковай умовай з'яўляецца наяўнасць рэгістрацыі на ЦТ ва ўстаноўленыя тэрміны — гэта значыць, да 1 чэрвеня бягучага года. Калі абітурыент у маі знаходзіўся за мяжой і не мог асабіста зарэгістравацца на ЦТ, за яго гэта маглі зрабіць законныя прадстаўнікі або прадстаўнікі абітурыента па падставе завяранай натарыяльна даверанасці.

Калі абітурыенты ўдзельнічалі ў ЦТ у асноўны дзень, але не змаглі дапісаць сваю работу з-за пагаршэння стану здароўя, яны змогуць скарыстацца рэзервовым днём. Для аказання абітурыентам медыцынскай дапамогі ва ўсіх пунктах правядзення тэсціравання былі арганізаваныя дзяжурствы медыцынскіх работнікаў, таму такія выпадкі фіксаваліся непасрэдна на месцы. А вось тыя, хто парушыў правілы ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні, здаць прапушчаны экзамен у рэзервовы дзень не змогуць.

Таксама тры рэзервовыя дні даюць шанц паўдзельнічаць у конкурсе на бюджэтныя месцы абітурыентам з Расіі, Казахстана, Кыргызстана і Таджыкістана, якія не паспявалі прыехаць у Беларусь у чэрвені, каб здаць ЦТ разам з беларусамі, паколькі ў гэты ж час здавалі свае нацыянальныя экзамены. У іх была адзіная магчымасць стаць студэнтам беларускай ВНУ — праходзіць гутарку восенню і паступаць на платную форму навучання як замежным грамадзянам з адпаведнымі «расцэнкамі» на вучобу.

Звяртацца з дакументамі, якія пацвярджаюць прычыну няяўкі на ЦТ, трэба ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт і Гомельскі дзяржаўны тэхнічны універсітэт. З сабой трэба мець таксама пропуск на тэсціраванне, якое было прапушчана, і дакумент, які сведчыць асобу абітурыента.

Пунктам правядзення цэнтралізаванага тэсціравання па ўсіх вучэбных дысцыплінах у рэзервовы дзень вызначаны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Іспыты будуць праходзіць на яго базе 6, 8 і 10 ліпеня. Пачатак у 11.00.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

## КАЛУМБІЯ ПАКІНУЛА СЕНЕГАЛ ПА-ЗА ЧЭМПІЯНАТАМ СВЕТУ

**У групе Н учора ўдзень адбыліся гульні трэцяга тура.**

У першым тайме матча Калумбія — Сенегал арбітр прызначыў, а потым адмяніў пенальці ў вароты лацінаамерыканцаў. Атакі афрыканцаў былі больш небяспечныя, і калумбійцы цудам не прапусцілі. Але ў другім тайме настойлівасць Калумбіі ўсё ж прывяла да гола Еры Міна з вуглавога. Нягледзячы на ўсе намаганні сенегальцаў, хоць адзін гол забіць яны не змаглі.

Японцы ў матчы з Польшчай відавочна былі нацэленыя захаваць першае месца ў групе, якое пасля двух тураў так нечакана для ўсіх самі сабе і забяспечылі. Яны і праяўлялі больш актыўнасці ў першым тайме, палякі дзейнічалі на контратаках. Але ў другім тайме каманда Польшчы вырашыла пагуляць па-сапраўднаму і нават забіла гол — пасля штрафнога вызначыўся Ян Беднарак. Японія ў выніку ўступіла, але па дадатковых паказчыках (табліцы фэйр-плэй) абышла Сенегал і заняла другое месца ў групе.

Такім чынам калумбійцы і японцы — у 1/8 фіналу.

**Іван КУПАРВАС.**

■ Надвор'е

## ХАЛОДНАЯ ХВАЛЯ МОЦНЫХ ДАЖДЖОЎ

### А ў нядзелю — усяго 11—17 цяпла

Заўтра надвор'е ў краіне вызначыць атмасферны фронт, услед за якім пачне паступаць халодная паветраная маса з поўначы Скандынавіі, паведамілі ў Белгідрамеце. Пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах — навальніцы і моцныя дажджы. Чакаецца парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы ад плюс 9 градусаў па паўночным захадзе да плюс 18 градусаў па паўднёвым усходзе краіны. Удзень 12—19 цяпла, па паўднёвым усходзе да плюс 22 градусаў.

Канчаткова надвор'е сапсуецца ў першы дзень ліпеня. Уначы ў асноўным па ўсходзе, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца дажджы, месцамі моцныя ліўні. Уначы і раніцай у асобных раёнах дажджы будуць суправаджацца моцным парывістым ветрам. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 8 да плюс 14 градусаў. Днём будзе ў асноўным 11—17 цяпла, толькі па ўсходзе краіны месцамі ад плюс 18 да плюс 20 градусаў. У панядзелак у асноўным воблачна, часам чакаюцца дажджы. Уначы ўсяго ад плюс 5 да плюс 11 градусаў, днём чакаецца 11—18 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у аўторак на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Удзень у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—12 цяпла, а ўдзень стане крыху цяплей — ад плюс 13 да плюс 20 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Здарэнне

## ЗАЦІСНУЛА СТАРШАКЛАСНІЦУ

**Ранкам ратавальнікам паступіла паведамленне пра дарожна-транспартнае здарэнне каля населенага пункта Новая Вёска Докшыцкага раёна.**

Калі падраздзяленні МНС прыбылі на месца, высветлілася, што вадзіцель мікрааўтобуса «Форд Транзіт» не справілася з кіраваннем, з'ехала ў кювет і ўрэзалася ў дрэва. Жанчына выбралася з транспартнага сродку самастойна да прыбыцця ратавальнікаў, яна не пацярпела. А ў салоне мікрааўтобуса заціснула 10-класніцу мясцовай школы. Работнікі МНС пры дапамозе спецыяльнага інструмента дэблакіравалі яе і перадалі брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі. Пасля агляду ў раённай бальніцы дзяўчыну адпусцілі дадому, яна таксама не пацярпела.

## НЕ ПАКІДАЙЦЕ ДЗЯЦЕЙ У МАШЫНЕ

**Ранкам на «101» паступіла паведамленне ад усхваляванай маладой мамы: у салоне аўтамабіля засталося грудное дзіця, а дзверы машыны зачыніліся, паведамілі ў МНС.**

На месца выкліку неадкладна выбылі ратавальнікі. У выніку было ўстаноўлена, што жанчына, выходзячы з легкавога аўтамабіля, выпадкова зачыніла дзверы, пасля чаго ў машыне спрацаваў цэнтральны замок. Пры гэтым у аўтамабілі засталося дзіця 2018 года нараджэння. Ратавальнікі прапанавалі жанчыне разбіць шкло аўто. Аднак тая вырашыла выклікаць платную службу па ўскрыцці замкоў. Спецыялісты, якія прыбылі, з работай не справіліся. Пасля чаго ратавальнікі ўсё ж разбілі пярэдняе левае шкло ў аўтамабілі. Дзіця ў выніку здарэння не пацярпела.

МНС Беларусі нагадвае: у спякоту ўсяго за паўгадзіны знаходжання машыны на сонцы тэмпература ў салоне павышаецца да 50—55 градусаў, за гадзіну паветра прагравaецца да 70 градусаў. Вынікам знаходжання дзіцяці ў аўтамабілі без нагляду могуць быць страшныя наступствы.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Імідж

# З ВЫСОКАЙ АДЗНАКАЙ ЯКАСЦІ

## Пацверджана спецыялістамі: Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт рыхтуе адных з найлепшых спецыялістаў у краіне

**Будучыя ўрачы, якія навучаюцца ў Гродне, а таксама тыя, хто ўжо атрымаў дыплом аб адукацыі, маюць прадмет для асаблівага гонару: іх альма-матар па выніках 2017 года стала лаўрэатам прэміі СНД за дасягненні ў галіне якасці прадукцыі і паслуг. Канчатковае рашэнне аб гэтым прымалася ў Маскве падчас 77-га пасяджэння Эканамічнага савета СНД.**



### Адзіная сярод беларускіх ВНУ

Сапраўды, ганарыцца ёсць чым: Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт стаў адзінай айчыннай ВНУ, якая атрымала гэты статус. Дарэчы, конкурс дастаткова складаны: ён праводзіцца адзін раз на два гады, а прымаць удзел у ім маюць права толькі пераможцы нацыянальных прэмій у галіне якасці. Сёлета лаўрэатамі аўтарытэтнай прэміі ў галіне якасці прадукцыі і паслуг сталі 10 прадпрыемстваў і арганізацый краін садружнасці, у тым ліку і Гродзенскі медыцынскі ўніверсітэт. А перад гэтым міжнародныя эксперты пабывалі ў Гродне і на месцы далі ацэнку па вызначаных кірунках. І што вельмі істотна, дасведчаныя спецыялісты з краін СНД высока адзначылі гродзенскі медуніверсітэт, што і дало падставу атрымаць ганаровы статус.

— Перамога ў такім прэстыжным міждзяржаўным конкурсе дазваляе ўтрымліваць лідарскія пазіцыі, мець імідж надзейнага вытворцы высакаякаснай і канкурэнтаздольнай паслугі, садзейнічае прыцягненню новых партнёраў і заказчыкаў і, безумоўна, адкрывае новыя магчымасці, — упэўнены **рэктар Гродзенскага дзяржаўнага медуніверсітэта, доктар медыцынскіх навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар СНЯЖЫЦКІ.**

### Навошта гэта трэба?

Як паведаміў суразмоўнік, сістэму менеджменту якасці тут пачалі ўкараняць дастаткова даўно, спачатку не ўсе разумелі навошта, але, калі вынікі сістэмнага падыходу ва ўсіх кірунках дзейнасці ўстановы сталі плённымі, стала зразумела — шлях абраны правільна. Дарэчы, універсітэт двойчы (у 2011 і 2016 гадах) станавіўся лаўрэатам прэміі ўрада Беларусі за дасягненні ў галіне якасці, што таксама пацвярджае правільнасць абранага кірунку.

Для эфектыўнага менеджменту ўніверсітэт укараніў сістэму збалансаваных паказчыкаў і рэйтынгавай ацэнкі выкладчыкаў, конкурсны адбор саіскальнікаў працы, электронны дакументаабарот, выкарыстоўваюцца статыстычныя метады аналізу вынікаў ацэнкі задаволенасці спажыўцамі.

Акрамя таго, ва ўніверсітэце распрацавана сеткавая камп'ютарная праграма «Маніторынг мэтавых паказчыкаў», якая не мае аналагаў у Беларусі. Што можна рабіць з яе дапамогай? Сачыць за выкананнем мэтавых паказчыкаў на розных узроўнях: ад кафедры і факультэта да ўніверсітэта наогул.

А што гэта дае для навучання будучых урачоў? Існуючая сістэма, запэўнівае кіраўніцтва ВНУ, а таксама выкарыстанне перадавых адукацыйных тэхналогій дазваляюць забяспечваць высокі ўзровень падрыхтоўкі. Сярод тэхналогій трэба адзначыць віртуальнае навучальнае асяроддзе Moodle, якое садзейнічае аптымізацыі дыстанцыйнага навучання, арганізацыі самастойнай работы студэнтаў, а таксама стварэнне сайтаў для анлайн-навучання.

### Як зарабіць на якасці?

Названыя і шматлікія іншыя фактары даюць падставы абітурыентам абраць для навучання менавіта гэты медуніверсітэт. У тым ліку і замежнікам, якіх прываблівае высокі ўзровень выкладання дысцыплін па-англійску, практыкаарыентаванасць навучання, а таксама яго даступны кошт. Як адзначыў Віктар Сняжыцкі, экспарт паслуг — таксама мэтавы паказчык сістэмы менеджменту якасці — за апошнія гады значна ўзрос. І калі 10 гадоў таму замежных студэнтаў было менш за сотню, то сёлета іх будзе амаль 800 чалавек. Дарэчы, летась экспарт паслуг склаў 3,5 млн долараў.

Што датычыцца практыкаарыентаванасці навучання, менавіта ў Гродне для студэнтаў яшчэ ў 2013 годзе адкрылася першая ў Беларусі лабараторыя практычнага навучання, аснашчаная сучаснымі трэнажорамі, манекенамі, сімулятарамі для засваення медыцынскіх маніпуляцый.



**Наша даведка**

**ГрДМУ — першая сярод медыцынскіх ВНУ краіны, дзе сертыфікавана сістэма менеджменту якасці, якая адпавядае патрабаванням СТБ ISO 9001 у Нацыянальнай сістэме пацвярджэння адпаведнасці Рэспублікі Беларусь і Нямецкай сістэме акрэдытацыі DAkkS.**

**Гродзенскі медуніверсітэт быў заснаваны ў 1958 годзе. Першы набор студэнтаў складаў 250 чалавек. У 1964 годзе адбыўся першы выпуск 248 урачоў, з якіх 22 атрымалі дыпломы з адзнакай.**

**Сёлета Гродзенскі дзяржаўны медуніверсітэт выпускае 774 урачы па пяці спецыяльнасцях.**

Таму цалкам зразумела, чаму пра выпускнікоў гэтай ВНУ можна смела казаць, што яны — з высокай адзнакай якасці. Даказана спецыялістамі.

УНП 500032863.

# ІЗНОЎ ІДЗЕ ПАСАДКА НА БАРТЫ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Хуткасць палёту самалётаў будзе складаць да 500 кіламетраў за гадзіну. Ці 125 метраў за секунду. Таму вынікова пагрэшнасць нават у адну секунду ўжо нясе рызыку і можа сапсаваць прыгажосць палёту паветранага разліку для гледачоў з зямлі. Сваё майстэрства лётчыкі адточваюць на аэрадроме 50-й змешанай авіяцыйнай базы, што месціцца ў Мачулішчах пад Мінскам. Туды і адправіліся карэспандэнты «Звязды».

Побач з узлётна-пасадачнай паласой знаходзіцца без навушнікаў даволі складана. Паветраныя караблі ўзлятаюць, а пасля заходзяць на пасадку адзін за адным. Разліковы час узлёту ўсіх 44 машын — усяго толькі 13 хвілін. А гэта значыць, што кожныя 15 секунд у неба ўздымаецца чарговы лятальны апарат. Час узлёту, параметры баявых парадкаў, вышыня і хуткасць размечаны з дакладнасцю да секунды. І вось у небе з'яўляецца белы Іл-76. Яго вядзе на пасадку **камандзір базы, палкоўнік Андрэй ЛУК'ЯНОВІЧ.**

— Пілатаваць самалёты на парадзе будуць толькі першакласныя афіцэры. Папярэдняя падрыхтоўка праводзілася не ва ўрон баявой. Зараз жа мы будзем праводзіць разбор палётаў. Прааналізуем усе элементы палётаў, пастраенне, падыход да пункта паказу ў зададзены час.

Парад праходзіць у цэнтры горада. А аэрадром знаходзіцца па-за яго межамі. Такім чынам, убачыць пралёт авіяцыі можна будзе і наўпрост з некаторых дамоў, якія праляга-юць па трасе яго следавання.

— Баявы парадак можна смела назваць унікальным, — працягвае Андрэй Лук'яновіч. — Паветраныя караблі пойдуць на чатырох хуткасцях. Верталёты, якія панясуць дзяржаўныя сцягі, праляцяць на хуткасці 60 км/г. Другія верталёты — на хуткасці ў 200 км/г. Самалёты Ан-26 і Як-130 будуць ляцець удвая хутчэй. У астатніх машын хуткасць складзе 500 кіламетраў за гадзіну.



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.



Побач з узлётна-пасадачнай паласой з'яўляецца **намеснік камандзіра 50-й змяшанай авіяцыйнай базы падпалкоўнік Уладзімір СКОРКІН.** Ён будзе вядучым звяна баявых верталётаў Мі-24. У паветры ж ён — з 2001 года.

— Буду ўдзельнічаць ужо ў трэцім парадзе. Місія вельмі адказная, — заўважае падпалкоўнік. — А наперадзе яшчэ — разбор палётаў, дзе збяруцца ўсе кіраўнікі, лётчыкі і персанал. Хоць мушу зазначыць, што Мі-24 прайшлі, як трэба, з нулявым адхіленнем ад графіка. Наперадзе сёння нас чакае яшчэ адзін трэніровачны палёт. Сумарна праводзім у паветры за дзень больш за дзве гадзіны.

* * *

А нашаму фотакарэспандэнту ўдалося падняцца ў неба на тым самым Іл-76.

Я ўпершыню лятала ў кабіне з лётчыкамі і бачыла ўсё, што і як яны рабілі. Гэта проста цуд! Прыехалі на аэрадром. Заканчваюцца апошнія падрыхтоўкі перад палётам. Восьвось пачнецца рэпетыцыя. Падыходзім да самалёта. Рухавікі гудуць. Я нічога не чую. Пілот бярэ мяне за руку, каб я не залезла, куды не трэба, ад шчасця будучага палёту. «Правай-левай, правай-левай, рукамі трымаешся тут і сядаеш!» Выконваю ўсе ўказанні пілота і сяджу ў чаканні мары пабач з экіпажам у Іл-76. Да гэтага ваенныя самалёты бачыла толькі ў кіно.



Фатаграфавацца да палёту ні ў якім разе нельга — дрэнная прыкмета. Толькі пасля таго, як паляцім. Я і не спрабую. Трымаюся, хоць і вельмі хацелася. Узлятаем. Набіраем хуткасць. Я ціхенька сяджу з заплюшчанымі вачыма і думаю: як жа гэта запомніць, на якія кнопкі ў які час націскаць. Як гэта ўсё магчыма?

Мне ласкава прапануюць падысці і сесці бліжэй. Радуюся. Перасоўвацца цяжка з непрывыкі. Я сяджу непасрэдна за камандзірам.

Сфатаграфаваць бы хоць што-небудзь. Але камера не слухаецца. Устаць не магу, кадр не атрымліваецца. «Ну і добра», — думаю я. Хоць бы незнарок не націснуць на што-небудзь, не зламаць. Ляцім над горадам, над Мінскім морам... Толькі паспявай трымацца. А пад крыламі самалёта — прыгажосць, якую нельга апісаць.

Нарэшце мы заходзім на пасадку. Першым з самалёта выходзіць камандзір Андрэй Лук'яновіч, потым усе астатнія. Устаю, расплываюся ва ўсмешцы і дзякую яму і ўсяму экіпажу за спраўджаную мару...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК, Таццяна ТКАЧОВА.**




## ВЯСЕЛЛЕ ПЕСНЯРА

Ад імя аднагодкаў і ўсім юным скептыкам скажу: нягледзячы на тое, што інтэрнэту ў наш час не было, жылі мы і ў вус не дзьмулі, ва ўсякім разе не сумавалі. «Файлы» былі жывымі. Замест «Выйду ў інтэрнэт» чалавек казаў: «Схаджу на сяло» (альбо ў горад, на вуліцу...), а ўжо там — як у вядомай песні: «дзеўкі гуляюць і мне весяло»...

Асаблівай папулярнасцю (і тады) карысталіся «фэйкавыя навіны», гэта значыць, чуткі, байкі, плёткі... Іншым разам яны за хвіліны ўсю акругу аблётвалі! І нават вярталіся, хоць «аўтар» іх мог не пазнаць: ведама — адна баба сказала, другая недачула, а трэцяя прыдумала...

Дарэчы, на вось гэту апошнюю, ніхто, можна сказаць, не крыўдзіўся — ніхто не шукаў «прыкалістку» ці «прыкаліста», якія часам знарок «укідвалі ў соцыум» нешта «смажанае».

І тады заставалася адно — пачакаць, пакуль кіно (прычым бясплатнае) выйдзе на «экран». Ну вось мяркуйце самі.

Справа была ў 70-я гады мінулага стагоддзя, у той час, калі нават з прасаў — не кажучы ўжо пра магнітафоны, радыё ды тэлевізары — пелі-залівалiся «Песняры», «Бітлы» ды Уладзімір Высоцкі. З імі людзі насіліся, як з велікодным яйкам: даставалі (гэта значыць, куплялі, адстаяўшы ў чарзе ці па вялікім блаце) пласцінкі, слухалі-спявалі песні, словы іх перапісвалі ў адмысловыя сшыткі... Трапіць на канцэрт — нават не марылі. А тут...

Карацей, па сяле пранеслася чутка, што ў адной з не вельмі далёкіх вёсак спраўляюць вяселле, дзеўка замуж ідзе... За каго? Ды фантастыка — за некага з «Песняроў»! Таму ансамбль у поўным складзе прыедзе на вяселле, будзе віншаваць маладых. «Гастролі» гэтыя — само сабой — нідзе не афішуюцца, але канцэрт будзе!

Чутка пра гэта (без інтэрнэту і мабільнікаў) ускалыхнула ўсю акругу, увесь раён (можа, нават пару суседніх). Яна ж памяняла ўсе планы, бо людзям — проста кроў з носа — трэба было ўбачыць ды «жыўцом» пачуць любімых артыстаў!..

Ну і рванулі — хто на чым мог: на машынах, трактарах, матацыклах, конна і на падводах... Па цемрані, па бездарожжы, з салодкім прадчуваннем, што вось зараз прыедзем...

Вяселле ў той вёсцы і праўда спраўляялі. Мясцовы гарманіст ва ўсю Іванаўскую «рэзаў» полечку, «Лявоніху», вальсок, то (калі хацеў пакурыць) ставіў любімую ўсімі пласцінку: песнярoўскі Ясь, у прыватнасці, «касіў канюшыну» ўжо разоў з пяць. І ўсё роўна людзям мала было, з вуліцы неслася:

— Пра Станіславу давай! Яшчэ раз!

Вясельнікі глянулі ў акно, і многія ўміг працверазелі: пад нарастаючы гул матораў і з усіх бакоў да іх «спаўзаліся» легкавушкі, самазвалы, матацыклы, трактары...

— Ура «Песнярам!», дзякуй, што прыехалі, мы вас любім! — неслася з халоднай цішы. — Мулявін, браце, Яся давай!

Гарманіст на ўсякі выпадак зноў паставіў пласцінку, але «нумар», што называецца, не прайшоў:

— Далоў «фанеру»! — патрабавала вуліца. — Давайце самі... Выйдзіце...

Маладая з маладым (бо хто ж яшчэ?) сабраліся на ганак. Прыездзеця тут жа кінуліся насустрач — да жаніха (ну які з «Песняроў»), аднак яго сцяной абступілі зухаватыя і п'януватыя сябры.

Што насцярожыла «гасцей» — сярод іх не было нікога нават злёгку падобнага да Мулявіна, да іншых артыстаў з пласцінак.

— Дык хто тут жэніцца? — сталі высвятляць «госці». — Дзе «Песняры»?

— Мабыць, на гастролях.

— Без жаніха?.. Ён хто там?

— Ён — Косцік Аўдзееў. У яго мянушка такая — Пясняр. Вусы бачылі?..

Разабраўшыся, што да чаго, усе палеглі ад смеху.

Потым, хто мог і каму перапала, выпілі за маладых, разам паспявалі пра Ясеву канюшыну ды разышліся.

...А вы кажаце, без інтэрнэту сумна было.

Больш так не кажыце.

**Іван Гаральчук,**
*г. Мінск.*

## НА ДОБРУЮ СПРАВУ

Мой знаёмец Лёня — апантаны натураліст. Ён можа днямі блукаць па лузе і лесе, назіраць за ўсім, што расце, што лётае, поўзае, ходзіць... Прычым не проста...

Аднойчы на вузкай сцежцы ён наткнуўся на ледзь жывую казулю, якая трапіла ў пастку. «Во свалата! — падумаў пра браканьераў. — Мала вам проста паляваць, калі ўжо так хочацца, дык яшчэ і пастак трэба наставіць!»

Нахіліўся ён да беднай жывёліны, дакрануўся да параненай нагі — убачыў, што без перавязкі тут не абыдзешся. Кінуўся званіць суседу:

— У цябе ж аптэчка ў машыне ёсць? — спытаў у Адама. — Тады тэрмінова за руль і едзь у лес.

— А што зрабілася? — занепакоіўся чалавек.

— Сам убачыш, — паабяцаў Лёня і назваў месца, дзе будзе чакаць.

Праз нейкія паўгадзіны суседзі сустрэліся. Удвух асцярожна вызвалілі казулю з пасткі, апрацавалі раны, забінтавалі.

Пасля гэтага Лёня застаўся пасядзець ля знясіленай прыгажуні, а сусед (ён часу не меў) падаўся дамоў — як быццам... І амаль адразу ж пазваніў: сказаў, што на дарозе яго спынілі даішнікі, праверылі дакументы і склалі пратакол — з-за некамплекту ў... аптэчцы.

«Во ліха, гэта ж з-за казулі, з-за мяне суседу прыйдзецца штраф плаціць», — падумаў Лёня і (шчасце, што мабільны ў кішэні) пазваніў начальніку ДАІ (яны знаёмыя — разам рыбачылі калі-нікалі). Стаў тлумачыць чалавеку, што адбылося, але паколькі той быў паблізу і на машыне, то сам прыехаў на месца здарэння, агледзеў казулю, сказаў Лёню, што наконт пратакола можа не хвалявацца: яго анулююць, бо на добрую справу пайшла аптэчка.

Казуля, быццам «пачуўшы» гэта, нясмела ўстала на ногі і памаленьку пакульгала ў лес.

**Васіль Пяшэвіч,**
*в. Юркевічы, Жыткавіцкі раён.*

## СОН І СОМ

...Усё ў гэтай гісторыі, як у казцы. Помніце, «Жылі-былі дзед ды баба...» Толькі не ля самага «сіняга мора», а ў нас, на беразе Дняпра.

А так — дзед і праўда быў казачны: ціхі і пакорлівы, баба — наадварот — ва ўсім верхаводзіла, хаця... Апошняе слова за дзедам было. Баба скажа, напрыклад: «Трэба зрабіць», ён тут жа: «Зараз».

У такой вось гармоніі яны і жылі, бо абое разумныя.

І на рыбу дзед той хадзіў — прыносіў дамоў, звычайную. (Гэта нядаўна два мужыкі ў нас на залатую нарвaліся: 44 кілаграмы злавілі... А рыбнагляд — іх. Зараз мала таго, што аштрафуюць, можа, яшчэ і пашлюць — золата здабываць.)

У дзедавай жонкі вока на яго, тое золата, не гарэла, бо тутэйшая: без патрэбы ёй і новы церам быў, і званне стаўбавой дваранкі ды ўладычыцы марской. Ёй над мужам уладарства хапала...

Нават начоўкі яе не цікавілі, бо дзед сам нарабіў — драўляненькіх: штук з дзесяць у кладоўцы стаяла — рознага памеру, адны ў адных.

А вось чаго бабе заўжды хацелася, дык гэта свежанькай рыбкі: сёння — такой, заўтра — гэтакай.

Неяк на абед яе душачка верхаводак запрасіла — «на вадзе» (гэта проста з патэльні — з перчыкам ды цыбулькай). Сказала старому: «Ідзі лаві!» А дзеда, як на ліха, сон змарыў: натупаўся ён і лёг бы. Але ж супраць бабы не папрэш. Уздыхнуў, бедны, сказаў: «Ну іду ўжо», ускінуў на плячо сетку ды паплёўся на раку.

Сеў там у човен, адштурхнуўся...

А на Гарадзішчы — гэта высокі бераг Дняпра — нашы мужыкі сядзелі: адпачывалі. І культурна так. Зверху як на далоні ўсё... Рэчка шырокая... Дзед Ванька з кустоў... Выплывае... Сетку ставіць. І...

Што гэта? Падсмык (вяроўка, за якую сетку трымаў) — з рук... Яна сабе плыве, човен сабе. А дзед хоць бы варухнуўся... Як слупок сядзіць...

Хлопцы:

— Можа, памёр?

І з таго жаху ўніз — да вады.

— Дзед, — гукаюць, — жывы?

— Га?.. Што?.. — не разумее той, прачнуўшыся. — Ды жывы, сыночкі, жывы. Гэта ж я задрамаў. Так мне спаць захацелася... А баба — яна ж мёртвага падыме (тая і праўда знахаркай была)... Бабе рыбы давай! Дык вы ўжо, сыночкі, — просіць дзед, — можа, сплаваеце па сетку (яна за кусты зачапілася на процілеглым беразе), а я тым часам пляшку прынясу.

Адкуль? Ну вядома ж, не з крамы.

Дадому прыходзіць, кажа (яму збрахаць, што плюнуць):

— Знаеш, бабка, сом у сетку ўблытаўся, ды такі аграменны... Даўжынёй, можа, метры са два! Паспрабуй — утрымай яго... Ды не еўшы-не спаўшы... Сплыў, халера, і сетку маю звалок. Хлопцы следам за ім пагналіся — можа, зловяць яшчэ... Ім бы аддзячыць... Хоць за сетку... Дай пляшку.

Баба, вядома ж, насварылася: сказала дзеду, што ён — і ёлупень, і бязрукі. Але ж пляшку дала. Дзед з той радасці пашыбаваў на бераг, а яна стала думаць, што ж рабіць, калі з сомам вернецца?

Пайшла ў кладоўку выцягваць начоўкі — самыя вялікія знізу былі.

...Хлопцы тым часам сетку дасталі. І нават з рыбай — з плоткамі, з верхаводкамі... Дзед, пасядзеўшы з мужыкамі, іх дадому прынёс: заказ такім чынам выканаў. А сома — жонцы сказаў (брахаць, дык брахаць) — нават хлопцы не ўтрымалі, хоць і маладыя!

— Бо ёлупні. І таксама бязрукія, — прызнала баба.

Потым плюнула і села чысціць рыбу.

Дзед жа, згодна з яе загадам, спачатку спарадкаваў ночвы і толькі потым лёг падрамаць.

Прачнуўся (жонка пабудзіла) да гатовага абеду:

— Ідзі, — загадала, — пад'еш, а то сёння табе хапіла. Натузаў той сом. Гэта ж трэба — два метры!.. А што «ўцёк», дык халера з ім: даплавецца, некалі нехта зловіць.

Можа, нават дзед?

**Соф'я Кусянкова,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

**АД ЯЕ Ж... Калі нейкая з гісторый (ці ўсе... Нагадаем, што падборкі іх друкуюцца па пятніцах) вам спадабалася, калі ласка, не выкідвайце газету: дайце пачытаць суседзям, пакладзіце ў шуфляду... Магчыма, некалі, з часам, прачытаеце іх яшчэ раз? А магчыма, успомніце нешта сваё і напішаце: адрасы — і паштовы, і электронны — у канцы нумара. Загадзя ўдзячны.**

■ Неасабісты суб'ектыў



# СТРЭМКА Ў СЭРЦЫ

## Малая радзіма: асобна ўзятыя складнікі

ПРЫЯЗДЖАЮ на мінулыя выхадныя дадому ў вёску, а там каля суседняй Гарошчышынай хаты фургон стаіць ды нейкія людзі завіхаюцца, цягаюць у яго няхітры бабулін нажытак — ложак драўляны, калаўрот, рассохлую вялізную бочку. «Гэта ж купілі нарэшце хату нейкія людзі з Мінска. Але ўмову прадаўцам паставілі, каб ніякага барахла ў ёй не было, каб усё чыста з будынка вынеслі», — тлумачыла мне іншая суседка, больш дасведчаная ў нашых вясковых справах, бо як прыязджае сюды на дачу ў красавіку, дык з'язджае толькі ў кастрычніку. Мы яшчэ колькі хвілін паназіралі за тым, як малады дужыя хлопцы спрытна цягаюць тую старую нефарбаваную мэблю, без асаблівага піетэту шпарачы яе ў фургон, дый разышліся па сваіх справах...

УЖО амаль тыдзень прайшоў, а тая пустая — адны сцены — самая старая ў вёсцы (гэта вам не жартачкі — 1925 года пабудовы!) хата чамусьці сядзіць стрэмкай у галаве і ў сэрцы, як нешта незваротна мной асабіста страчанае. Праз гады я памятаю нават яе пах. Бабуля Гарошчыха жыла адна, была самотнай і, здавалася тады, не вельмі любіла людзей, таму трапіць да яе ў жытло было справай не звычайнай. Але па-суседску час ад часу мама ці бабуля адпраўлялі мяне туды штосьці занесці або пазычыць. Хата тая для дзіцяці, якое гадавалася ў пакоях з дывановымі дарожкамі ды кілімамі на сценах, была сапраўды казачнай. Падлога ў ёй была нефарбаваная, а ў сенцах яе зусім не было. Шпалеры былі паклееныя, напэўна, толькі аднойчы і калісьці даўно-даўно мелі блакітны колер. Немудрагелістая старая мэбля была акурат такая, як тая, што, даўно закінутая, стаяла ў нас на гарышчы. Газавай пліты ў бабулі не было ў прынцыпе, гатавала яна ў печы, у якой паліла кожны дзень. Таму ў яе хаце заўсёды пахла нейкім крупнікам (здавалася тады — няма смачнейшай стравы), вышараванымі шэрымі дошкамі падлогі і зёлкамі, што вялізнымі венікамі віселі на сценах у сенцах...

Увогуле да даброт цывілізацыі наша суседка ставілася з асцярогай. Электрычнае святло, асабліва ў зале, паліла вельмі рэдка, нават зімой. Калі ж раптам вокны ў хаце ў Гарошчыхі нязвыкла ярка ўспыхвалі ўвечары, мае старэйшыя трывожна перагаворваліся: «Пэўна, нешта здарылася», а калі святло доўга не гасла, хтосьці з іх насоўваў на ногі валёнкі ды ішоў глядзець, ці сапраўды, крый божа, чаго не нарабілася. Бо, па сутнасці, акрамя суседзяў, справы да бабулі нікому не было.

БАБКА Жэня не была старой дзеўкай, што дажывала ў вёсцы свой век. У яе калісьці былі муж і сын. Але муж Міхал памёр малады, а сын, калі яму было дзесяць гадкоў, трапіў пад капыты раз'юшанага бычка. У малога быў разбіты мачавы пузыр, і, каб гэта здарылася ў наш час, дзіця б напэўна выратавалі, а тады хлопчык сканаў праз дзень. Так і засталася яна адна — жыла доўга, пэўна, за ўсіх — і за сына, і за мужа, была не вельмі ветлівая, нават крыху жорсткая да іншых людзей. Вельмі любіла сваю пярэстую кошачку (яна так і звала яе, бы па мянушцы — Кошачка), дзялілася з ёй сваёй простай ежай, гладзіла нязграбнымі скручанымі ад цяжкай працы пальцамі, і ўздзячная жывёлка аддана ўсюды хадзіла за ёй, бы хвосцік. Жыла бабка бедна — на пенсію ў дваццаць восем рублёў, як і ўсе савецкія калгаснікі, што ў 50-я рвалі свае жылы за палачкі-працадні. Самую цяжкую работу, нават калі ёй было за восемдзесят, рабіла сама. Напрыклад, усё лета і восень нарыхтоўвала сабе дровы. Такой і запомнілася яна праз гады — у паркалёвай хустцы, у чырвоных кедах стаіць пад старой дзічкай ля сваёй хаты і павольна пілуе нажоўкай пакладзеную на перакошаныя козлы тоўстае бярозавае палена...

Калі бабуля занядужала, яе забраў да сябе на зіму пляменнік. Але праз месяц яна вярнулася — не змагла вытрываць тэлевізара, які, скардзілася, «раве на ўсю хату». Праз нейкі час яна зусім аслабла, не магла даглядаць сябе, і мама з іншымі суседкамі насілі ёй паесці. Нарэшце ўдалося ўладкаваць бабку ў дом для састарэлых, і там яна ў доглядзе пражыла яшчэ некалькі гадоў. Аднаяскоўцы аднойчы ездзілі праведаць яе ў той дом дзесьці за Маладзечнам, у нас нават фота ёсць, на якім яна са сваімі гасцямі — сівенькая, чысценькая, і, можа, упершыню за доўгія гады — шчаслівая.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zviazda.by, (для званотаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2351.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 28 чэрвеня 2018 года.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
29 чэрвеня 2018 г. № 26 (459)



стар. 2
Святло паставілі на «паўзу»



стар. 14
Хоцімскі варыянт дапамогі



стар. 16
Нормы для прыватнага сектара

ТЭМА НУМАРА

# ФОРМА І ЗМЕСТ

## Як адна мясцовая ініцыятыва стала штуршком да грамадскай актыўнасці жыхароў пасёлка



**Формы работы дэпутатаў мясцовых Саветаў бываюць розныя. Найчасцей даводзіцца чуць, што галоўнай задачай народнага абранніка становіцца работа з насельніцтвам. Але ж дэпутат сельскага Савета не ладзіць прыёмы выбаршчыкаў, як парламентарый, — у яго няма такой патрэбы, бо ён бачыцца з выбаршчыкамі ледзь не кожны дзень. Тады што лічыць работай з насельніцтвам? Напэўна, канкрэтную справу, да якой здольны заахвоціць жыхароў народны абраннік і якую можа ўзначаліць сам. Калі дэпутацкая ідэя выліваецца ў пэўную карысную грамадскую справу — гэта ёсць вынік правільна пастаўленай работы з насельніцтвам. Так выйшла і ў невялічкім пасёлку Кобрынскага раёна з крыху дзіўнай назвай Птушкафабрыка.**

### Спачатку было слова. Дэпутата

Спачатку была ідэя **дэпутата Батчынскага сельскага Савета Алы САПЯЖЫНСКАЙ** наконт гранта — а цяпер яна ператварылася... у цудоўную пляцоўку для адпачынку дзяцей і дарослых з арэлямі, батутам, спартыўнымі збудаваннямі. І гэта далёка не канец праекта, гавораць мясцовыя жыхары.

— А пачыналася ўсё з сельскага сходу, — згадвае **старшыня Батчынскага сельскага Савета Святлана ГАНГАЛА.** — На адным са сходаў жыхароў Птушкафабрыкі людзі



настойліва прасілі, каб сельвыканкам абсталяваў хоць бы зусім невялікую дзіцячую пляцоўку: маўляў, нашы дзеці не маюць магчымасці нават у пяску пагуляць, не кажучы ўжо пра іншыя забавы. А чым яны горшыя за гарадскіх? Я тады падумала, што давядзецца паставіць дзве лаўкі, пясочніцу і тым абмежавацца. Бо на большае ў мясцовага органа ўлады проста грошай не было.

Але выступіла дэпутат Ала Сапяжынская, расказала пра кобрынскі клуб дзелавых жанчын «Бона», пра яго цікавыя справы і прапанавала праз гэтую грамадскую арганізацыю падаць заяўку на грант.

стар. 5

АКЦЭНТЫ

# БАЧЫЦЬ МАШТАБНА,

## знаходзіць пункты росту рэгіёнаў



**Выязное пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, якое прайшло ў Гродзенскай вобласці, вызначыла першачарговыя задачы ў рабоце мясцовых Саветаў на найбліжэйшую перспектыву. Аб павышэнні адказнасці дэпутацкага корпуса ў рэгіёнах і шляхах вырашэння набалелых праблем інтэрв'ю старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра ПАПКОВА.**

**— Аляксандр Андрэевіч, аналізуючы вынікі нядаўняга выязнога пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання ў Гродзенскай вобласці, што вы адзначылі б у першую чаргу?**

— Галоўны прыярытэт у фарміраванні эфектыўнай рэгіянальнай палітыкі — чалавек з яго праблемамі і патрэбамі. Гэты пастулат быў узяты за аснову пры падрыхтоўцы пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі, якое адбылося ў Гродзенскай вобласці. У рамках выканання пратакола даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі Савет Рэспублікі ў тры этапы праводзіць пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, прысвечаныя павышэнню ролі мясцовых органаў улады ў фарміраванні эфектыўнай эканомікі на рэгіянальным узроўні і паляпшэнні жыццезабеспячэння насельніцтва.

Першае пасяджэнне адбылося ў Слаўгарадзе ў канцы красавіка. Разам з актывам Магілёўскай і Гомельскай абласцей мы абмеркавалі тэму павышэння ролі органаў мясцовага самакіравання ў вырашэнні пытанняў устойлівага развіцця рэгіёнаў. У Ашмяны і Астравец мы запрасілі кіраўнікоў Саветаў дэпутатаў Гродзенскай і Брэсцкай абласцей і зрабілі акцэнт на праблемах павышэння эфектыўнасці работы прадпрыемстваў і прыцягнення інвестыцый у эканоміку мясцовых бюджэтаў. Наступнае пасяджэнне ў найбліжэйшы час плануем правесці ў Барысаве, каб працягнуць размову па пытаннях фарміравання рэгіянальнай палітыкі са старшынямі раённых Саветаў дэпутатаў ужо Мінскай і Віцебскай абласцей.

Гаварыць сумленна і адкрыта пра набалелыя праблемы — першапачаткова зададзеная танальнасць удзельнікаў усіх пасяджэнняў Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання. У цэлым у краіне, нягледзячы на дасягнутыя поспехі апошніх гадоў, — нізкі ўзровень інфляцыі, аднаўленыя аб'ёмы экспарту, паляпшэнне структуры плацежнага балансу, — застаецца нявырашаным шэраг сацыяльна-эканамічных праблем.

стар. 3

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# «План дзеля плана нікому не патрэбны»

*У Баранавічах абмеркавалі развіццё горада і раёна*

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ у Баранавічах прыняў удзел у нарадзе па пытаннях рэалізацыі комплексных планаў сацыяльна-эканамічнага развіцця горада і Баранавіцкага раёна да 2020 года.**



Міхаіл Мясніковіч запатрабаваў ад мясцовых улад прыняцця больш эфектыўных мер па выкананні комплексных планаў. Ён падкрэсліў, што праца, якая ажыццяўляецца ў рэгіёне, пакуль не прыносіць чаканых вынікаў. Прычыну спікер верхняй палаты бачыць у адсутнасці сістэмнай і комплекснай работы, эфектыўнасць якой павінна быць дакладна пралічана.

«План дзеля плана нікому не патрэбны. Гэта павінен быць сапраўды практычны дакумент для ўсёй вертыкалі мясцовай улады», — падкрэсліў ён.

Асаблівую ўвагу старшыня Савета Рэспублікі звярнуў на праблемныя пытанні апрацоўчай прамысловасці, будаўнічай індустрыі, падкрэсліў неабходнасць вытворчасці інавацыйнай прадукцыі. На асаблівым кантролі — эфектыўнасць работы арганізацый сельскай гаспадаркі. Асобна Міхаіл Мясніковіч спыніўся на бягучым стане спраў на ААТ «Баранавіцкае вытворчае баваўнянае аб'яднанне». У ліку пазначаных для аб'яднання прыярытэтаў — пашырэнне асартыменту і павелічэнне экспарту.

# За імкненне да «залатога стандарту»

*Парламент узнагародзіў кіраўніка Дзяржкамітэта па стандартызацыі*

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Мар'яна ШЧОТКІНА ўручыла Ганаровую грамату Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Віктару НАЗАРАНКУ.**

Старшыня Дзяржстандарта ўзнагароджаны Ганаровай граматай за заслугі ў развіцці заканадаўства і вялікі ўклад у фарміраванне і рэалізацыю эканамічнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

«Мы ўдзячныя вам за сумесную працу і асобна за той уклад, які Дзяржаўны камітэт па стандартызацыі і вы асабіста ўносіце ва ўстойлівае развіццё. Праца камітэта і яго прапановы маюць вялікае значэнне», — падкрэсліла Мар'яна Шчоткіна.

У сваю чаргу Віктар Назаранка падзякаваў за ўзнагароду, адзначыўшы, што гэта ацэнка працы ўсяго калектыву камітэта.

# Увесь свет пабачыць

*Тэлеканал «Беларусь 24» — галоўны інфармацыйны партнёр V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі*

**Міжнародны спадарожнікавы тэлеканал «Беларусь 24», які штодня і кругласутачна расказвае ўсяму свету, чым жыве сучасная Беларусь, стаў галоўным інфармацыйным партнёрам V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які пройдзе ў кастрычніку ў Магілёве.**

У эфіры і на сайце тэлеканал паведаміць пра самыя цікавыя мерапрыемствы форуму і іх падрыхтоўку. Сёлета ўдзельнікаў і гасцей форуму чакае цікавая і насычаная праграма — дзелавая і забаўляльная. Гэта Савет дзелавога супрацоўніцтва, пасяджэнне Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве, секцыйныя пасяджэнні. Будуць арганізаваны Тыдзень інтэграцыі і супрацоўніцтва, Маладзёжны форум, злёт студэнцкіх атрадаў, спартакіяда Саюзнай дзяржавы для дзяцей і юнацтва, турнір па хакеі з шайбай спартакіяды Саюзнай дзяржавы для дзяцей і юнацтва, выстаўка-кірмаш раместваў.

Галоўнай падзеяй форуму стане пленарнае пасяджэнне на тэму «Прыярытэтныя напрамкі развіцця рэгіянальнага супрацоўніцтва як ключавога фактару інтэграцыі і саюзнага будаўніцтва». Чакаецца, што ў ім возьмуць удзел кіраўнікі дзяржаў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

А Ў НАС... А Ў ВАС?

# СВЯТЛО «НА ПАЎЗЕ»

## У рэжыме жорсткай эканоміі асвятляюцца вуліцы сельскіх населеных пунктаў летам

**Нават у народным фальклоры на розныя лады апяваецца, што летнія купальскія ночкі праходзяць хутка, бо зусім маленькія. Апошняя акалічнасць, як высветлілася, цікавіць не толькі маладых ды закаханых, але і мясцовую ўладу, якая размяркоўвае сродкі, выдзеленыя на вулічнае святло, і думае, як іх лепш эканоміць. Але адсутнасць прывычнага святла на вясковых вуліцах часам выклікае нараканні і скаргі грамадзян... Як гэта пытанне вырашаецца ў асобных рэгіёнах Брэстчыны, мы пацікавіліся ў кіраўнікоў Саветаў розных узроўняў.**

**Аляксандр САРОКА, старшыня Івацэвіцкага раённага Савета дэпутатаў:**

— У летнія месяцы вулічнае асвятленне амаль не ўключаем. Эканомім. Кожны год з раённага бюджэту выдзяляецца пэўная сума грошай, якіх павінна хапіць да наступнага года. Каб не здарылася так, як два гады таму ў Брэсце, калі горад часткова застаўся без святла ў снежні, — гэты ліміт трэба разумна расходаваць. Таму мы і дамовіліся з жыхарамі вёсак на сходах, што летам будзем рабіць перапынак у асвятленні. А першага верасня, калі дзеці пачынаюць хадзіць у школу, на вуліцы па-ранейшаму вяртаецца святло. І павінен сказаць, у абсалютнай большасці сельскія жыхары праяўляюць разуменне. Цяжэй бывае знайсці падтрымку ва ўчастковых інспектараў — яны лічаць, што цемра спрыяе крымінальным учынкам. Але гэта спрэчнае пытанне. Калі хто задумаў благое, ён і ліхтарыкам пасвеціць. А іншы, хто захацеў палазіць па чужых падворках сп'яна, можа, наадварот, пабаіцца цемры...

Старшынь сельскіх Саветаў арыентуем не цалкам пакідаць вёскі без святла. Як правіла, адзін ліхтар гарыць каля клуба альбо СДК, калі там праводзяцца танцы ці іншае мерапрыемства, часам пакідаюць ліхтар каля магазіна. Астатнія ж асвятляльныя прыборы бяруць паўзу.

Апошнім часам раён набыў дарагія рэле для вулічнага асвятлення, таму раённыя электрасеткі трымаюць асобную брыгаду спецыялістаў для абслугоўвання сельскіх населеных пунктаў. Абслугоўванне складаных прыбораў, заўважу, не таннае, таму даводзіцца эканоміць цяпер, каб позняй восенню і ўзімку не ўзнікала ніякіх надзвычайных сітуацый і звязаных з імі нязручнасцяў.

**Аляксандр ЯРАШЭВІЧ, старшыня Столінскага раённага Савета дэпутатаў:**

— У нас раён даволі вялікі, ёсць буйныя населеныя пункты, таму пытанні асвятлення вырашаюцца паразнаму. Скажам, у Давыд-Гарадку свой падыход, а ў Альшанах — свой. У Альшанах, дзе нават аптовы рынак сельгаспрадукцыі ёсць, названы аб'ект асвятляецца ўсю ноч. Пытанні вулічнага асвятлення вырашаюцца мясцовай уладай, гэта значыць сельскімі, гарадскім, пасялковым Саветамі на сесіях альбо прэзідыумах выканкамаў.



**Таццяна ВАСЮХНЕВІЧ, старшыня Велікамалешаўскага сельскага Савета дэпутатаў Столінскага раёна:**

— Гэта адно з галоўных пытанняў жыццядзейнасці сельскай тэрыторыі. Мы падыходзім да яго вырашэння надзвычай сур'ёзна. Схему асвятлення кожнага з пяці населеных пунктаў зацвярджаем на сесіі сельскага Савета, а потым гэтай схемы строга прытрымліваемся. У нас пражывае 5800 чалавек насельніцтва, сельсавет, як бачыце, вялікі. І ў асенне-зімовы перыяд бывае нямала нараканняў, калі дзеці вяртаюцца з заняткаў у другую змену альбо дарослыя рана выпраўляюцца на работу, а ліхтар недзе не гарыць. Таму, каб асвятленне працавала бездакорна з восені да позняй вясны, летам яно пераводзіцца ў надзвычай ашчадны рэжым. Але поўнасцю вёскі без святла мы не пакідаем. Асвятленне застаецца на цэнтральных вуліцах, пры гэтым у адной з вёсак у нас летам уключаецца да сямі ліхтароў, у другой — толькі два. Глядзім па сітуацыі, і людзі падказваюць, у якім месцы пакінуць святло на скрыжаванні, у якім, напрыклад, — каля будынка школы.

**Іосіф ГУЗІЧ, старшыня Пінскага раённага Савета дэпутатаў:**

— Да асвятлення ў летнюю пару, як і нашы калегі, падыходзім ашчадна. Праўда, у такіх населеных пунктах, як Пінкавічы, Малоткавічы, вёсках столінскага кірунку, дзе праходзяць дарогі рэспубліканскага значэння, святло гарыць. Гэта патрабаванне правілаў бяспекі. А ў невялікіх вёсках цяпер, калі ў адзінаццаць вечара яшчэ светла, а пасля чатырох раніцы пачынае віднець, траціць дарагую электраэнергію неразумна і нерацыянальна.

**Алена СІНЮЦІЧ, старшыня Ласіцкага сельскага Савета дэпутатаў Пінскага раёна:**

— Наш сельсавет адзін з самых аддаленых у раёне, мы жывём на мяжы з Украінай у вельмі прыгожай маляўнічай мясціне. Па тэрыторыі сельсавет вялікі, а па насельніцтве, наадварот, маленькі — 1200 чалавек. Адсюль і сціплы бюджэт, і неабходнасць жорсткай эканоміі. Летам мы бяром перапынак у асвятленні вясковых вуліц. Адзін ліхтар пакінулі на ўездзе ў Ласіцк. Тут вельмі небяспечны паварот, былі выпадкі аварый, таму мы вырашылі тут не эканоміць на асвятленні ў цёмны час для бяспекі людзей. Усе астатнія ліхтары на летнія месяцы выключаюцца. Работнікі электрасетак нават забіраюць рэле на гэты час, бо, па-першае, гэтыя прыборы часта цярпяць ад маланак, а па-другое, праводзяцца іх рамонт, прафілактыка, пераналадка. А ўжо з восені яны будуць запраграмаваны на пэўны час.

**Уладзімір ХВАЦІК, старшыня Брэсцкага раённага Савета дэпутатаў:**

— Лічу, што адключэнне асвятлення ў летні перыяд азначае разумную эканомію. Навошта спальваць бюджэтныя грошы там, дзе варта ўсё пралічыць і падысці рацыянальна? У нашым раёне ёсць шэраг буйных населеных пунктаў, праз якія праходзіць рэспубліканскія дарогі. Вядома, цэнтральныя вуліцы гэтых вёсак падсвечваюцца і ў начны час. Гаворка ідзе, напрыклад, пра Страдзеч, Матыкалы, Мухавец, Чарнаўчыцы і іншыя. А невялікія вёскі ўбаку ад вялікіх дарог могуць і не асвятляцца ў летнія месяцы. Колькі цяпер той ночы!

Заўважу, што не заўсёды па гэтых пытаннях мы знаходзім паразуменне з работнікамі міліцыі. Але і сам, як былы супрацоўнік праваахоўнай сістэмы, пры кожным зручным выпадку напамінаю калегам, што грошы ў бюджэт з неба не падаюць, яны зарабляюцца агульнай працай. Таму ставіцца да бюджэтнага рубля трэба з павагай.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

ХУТКА І ЗРУЧНА

# ДАСТАТКОВА ТОЛЬКІ ПАЗВАНІЦЬ

## Дзе ў раёне можна здаць непатрэбную электроніку?

**У Мар'інай Горцы адкрылі пляцоўку для адходаў электроннага і электрычнага абсталявання. Будаўніцтва аб'екта адбылося пры падтрымцы акцыянернага таварыства «Экапартнёрства» ў рамках праекта «Развіццё ў сферы кіравання адходамі для сельскага насельніцтва Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці», які фінансуецца Еўрапейскім саюзам.**

Зараз жыхарам раёна дастаткова звязацца з дыспетчарам УП «Жыльцяплосэрвіс» Пухавіцкага раёна і ўзгадніць час вывазу згаданых адходаў. Акрамя гэтага, гараджане і сельскія жыхары могуць самастойна ў зручны для іх час адвезці старую бытавую тэхніку або батарэйкі на пляцоўку, дзе таксама размешчаны кантэйнеры для збору пластыка, паперы, шкла і ртуцьзмяшчальных лямпаў.

— Дзякуючы ўдзелу ў гэтым праекце сёння мы можам прыехаць у любы пункт раёна ў зручны для людзей час і забраць адходы, якія раней маглі апынуцца дзе-небудзь на вуліцы, — кажа **дырэктар унітарнага прадпрыемства раёна Іосіф КУЧКО.** — Акрамя гэтага, у рамках ініцыятывы нам удалося ўцягнуць у працу вялікую колькасць школьнікаў, якіх мы вучым правільна сартаваць адходы.

Гэты праект рэалізуецца ў Мінскай вобласці з 2016 года, яго бюджэт складае 391,7 тысячы еўра. Акрамя пляцоўкі, у рамках ініцыятывы ўжо атрымалася ўстанавіць кантэйнеры для адпрацаваных батарэек, набыць грузавы міні-аўтобус для збору электрычнага абсталявання ў раёне, бульдозер для ліквідацыі звалак, драбільны коўш і лінію для прасавання ПЭТ-бутэлек. Таксама ў сельскіх школах былі добраўпарадкаваны пляцоўкі для кампаставання арганічных адходаў, а ў раёне было ўстаноўлена дзве камеры для маніторынгу несанкцыянаваных звалак.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Бачыць маштабна...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Па выніках студзеня — мая 2018 года ва ўсіх рэгіёнах Беларусі дасягнута станоўчая дынаміка па валавым рэгіянальным прадукце. Разам з тым гэты паказчык у разліку на душу насельніцтва значна адстае ў параўнанні з іншымі развітымі краінамі. Пачынаючы з мінулага года назіраецца тэндэнцыя росту сярэдняй заработнай платы. У той жа час яе рост не збалансаваны з ростам прадукцыйнасці працы. Па выніках I квартала 2018 года па ўзроўні сярэдняй заработнай платы Брэсцкая вобласць займае чацвёртае месца сярод рэгіёнаў рэспублікі, Гродзенская вобласць — пятае. Нямала праблем у рабоце прамысловасці і сельскай гаспадарцы, ёсць нявырашаныя пытанні ў будаўніцтве жылля, напружанай застаецца сітуацыя на рынку працы.

> У Год малой радзімы мы павінны запусціць механізм устойлівага развіцця тэрыторый.

Але важна не толькі вызначыць і паставіць праблемныя пытанні. Трэба знайсці шляхі іх вырашэння. Падчас падрыхтоўкі пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні ў Гродзенскай вобласці ставілася мэта на прыкладзе абмеркавання болевых пунктаў рэгіёна настроіць усіх прадстаўнікоў мясцовых органаў улады на прамую канструктыўную размову аб прычынах існуючых праблем і вызначыць шляхі іх вырашэння. Кожны кіраўнік павінен дакладна ўяўляць слабыя і моцныя месцы эканомікі свайго прадпрыемства, раёна або вобласці і на падставе аналізу вызначаць дакладную стратэгію далейшага развіцця.

> На жаль, у некаторых сучасных кіраўнікоў няма маштабнага бачання перспектыў, адсутнічае рынкавае мысленне, а ёсць некаторая зацыкленасць на вырашэнні дробных бягучых задач.

**— Паспяховае развіццё рэгіёнаў вызначаецца і ўзроўнем даходаў мясцовых бюджэтаў. Але як сёння развіваць эканоміку, калі большасць раёнаў датацыйныя?**

— Гэту праблему мы ўсебакова абмяркавалі на нарадзе ў Ашмянах і Астраўцы. У той жа Гродзенскай вобласці з 17 раёнаў толькі Гродзенскі з'яўляецца бездатацыйным. У Воранаўскім, Зэльвенскім, Карэліцкім, Мастоўскім, Свіслацкім раёнах датацыі складаюць звыш 50 % да агульнага аб'ёму даходаў. З улікам рэгіянальных асаблівасцяў мясцовыя органы ўлады павінны дакладна вызначыць тыя кірункі, тыя перспектыўныя вытворчасці, якія дазволяць атрымаць дабаўленую вартасць і вывесці праблемныя раёны з залежнасці ад рэспубліканскіх датацый.

Там жа, у Ашмянах, мы азнаёміліся з шэрагам паспяховых прадпрыемстваў раёна, якія выпускаюць запатрабаваную і канкурэнтаздольную прадукцыю, атрымліваюць прыбытак і нядрэнна развіваюцца. Значыць, ёсць магчымасці і можна знайсці нявыкарыстаныя нішы на рынку, калі падыходзіць да вырашэння праблем з веданнем справы. На жаль, у некаторых сучасных кіраўнікоў няма маштабнага бачання перспектыў, адсутнічае рынкавае мысленне, а ёсць некаторая зацыкленасць на вырашэнні дробных бягучых задач. Такая пазіцыя не прыносіць поспеху і не дазваляе рухацца наперад.



Падчас выязнога пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання ў Ашмянскім раёне.

Рашэннем Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання мясцовым Саветам дэпутатаў і выканаўчым камітэтам рэкамендавана ў мэтах фарміравання эфектыўнай рэгіянальнай палітыкі па кожным раёне вызначыць пункты эканамічнага росту, канкурэнтныя перавагі кожнага раёна і выпрацаваць адпаведныя напрамкі развіцця, уключаючы эканоміку і фінансы, геаграфічнае становішча, прамысловую і сацыяльную інфраструктуру, стан аграпрамысловага комплексу.

Напрыклад, у Гродзенскай вобласці ў большай ступені павінны быць выкарыстаны магчымасці яе геаграфічнага размяшчэння: шэраг раёнаў мяжуе з краінамі Еўрасаюза. Сярод канкурэнтных перавагаў гэтага рэгіёна — развітая камунікацыйная інфраструктура, высокі ўзровень урадлівасці сельскагаспадарчых зямель, наяўнасць значных радовішчаў карысных выкапняў для прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. З улікам гэтых перавагаў у вобласці цэнтрамі эканамічнага росту вызначаны восем адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак.

**— Аляксандр Андрэевіч, зыходзячы са сказанага вамі, мясцовыя органы ўлады цяпер павінны неяк перабудаваць сваю працу?**

— Ім неабходна заняць актыўную пазіцыю і ўзяць адказнасць за развіццё сваёй вобласці, раёна, горада ці пасёлка. Прэзідэнтам пастаўлена няпростая задача: у найбліжэйшыя сем гадоў выйсці на ўзровень ВУП у 100 мільярдаў долараў, тым самым павысіць узровень жыцця насельніцтва ў краіне. І пачынаць гэту працу трэба з асобна ўзятага раёна і вобласці. Пакуль кожны кіраўнік — ад старшыні сельгаспрадпрыемства, сельскага Савета да кіраўніка абласнога і рэспубліканскага ўзроўню — не зразумее для сябе, што гэта яго адказнасць і яго задача, дамагчыся запланаванага выніку будзе складана.

> Мясцовым Саветам дэпутатаў трэба больш эфектыўна выкарыстоўваць нададзеныя заканадаўствам паўнамоцтвы па вырашэнні пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў.

Пры неабходнасці ўносіць адпаведныя карэкціроўкі падчас абмеркавання праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця сваёй адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, а таксама актыўна ўцягваць у работу па ажыццяўленні кантролю за выкананнем усіх прынятых праграм дэпутацкі корпус.

У краіне сфарміравана дастатковая заканадаўчая база. Патрэбна дакладнае яе выкананне. У рэгіёнах неабходна зараз працаваць над стварэннем сучасных і запатрабаваных на рынку вытворчасцяў, якія будуць фарміраваць дабаўленую вартасць і спрыяць сацыяльна-эканамічнаму развіццю сваёй тэрыторыі.

Рашэннем Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання ў Гродзенскай вобласці прапанавана свайму актыву ўключыцца ў работу па стварэнні інавацыйных вытворчасцяў, якія выкарыстоўваюць рэсурса- і энергазберагальныя тэхналогіі. На базе іх неабходна арганізаваць выпуск прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю, арыентаванай на экспарт. Стварэнне новых рабочых месцаў дазволіць стымуляваць занятасць мясцовага насельніцтва, спыніць працоўную міграцыю і ў цэлым павысіць дабрабыт людзей.

**— Да пытання аб занятасці. На пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання вялікая ўвага была ўдзелена рэалізацыі Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 1. Якая роля ў гэтай рабоце адводзіцца мясцовым Саветам дэпутатаў?**

— Саветам дэпутатаў трэба будзе арганізаваць дзейнасць пастаянна дзеючых камісій па садзейнічанні занятасці насельніцтва. У гэту работу павінен актыўна ўключыцца і дэпутацкі корпус сельскіх, гарадскіх і раённых узроўняў. Неабходна прыцягнуць да гэтай тэматыкі сродкі масавай інфармацыі ў мэтах інфармавання насельніцтва і тлумачэння сацыяльна-працоўных гарантый, якія даюцца дзяржавай.

> Кожны кіраўнік павінен дакладна ўяўляць слабыя і моцныя месцы эканомікі свайго прадпрыемства, раёна або вобласці і на падставе аналізу вызначаць дакладную стратэгію далейшага развіцця.

Хто, як не дэпутат, павінен ведаць усе праблемы сваіх выбаршчыкаў? Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання ў выніковым рашэнні выязнога пасяджэння рэкамендуе ўвесці ў практыку кожнага дэпутата падрыхтоўку пісьмовага заключэння аб магчымасці поўнага або частковага вызвалення працаздольных грамадзян, не занятых у эканоміцы, або членаў іх сем'яў ад аплаты паслуг з пакрыццём выдаткаў у сувязі са знаходжаннем у цяжкай жыццёвай сітуацыі.

Галоўная задача сёння і мясцовых органаў улады, і пастаянна дзеючых камісій па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва — прапанаваць рабочае месца ўсім працаздольным грамадзянам з улікам іх кваліфікацыі і такім чынам забяспечыць ім годны ўзровень жыцця. Гэта можна зрабіць шляхам стварэння высокапрадукцыйных вытворчасцяў, пра якія казаў вышэй.

Зараз мы вядзём вялікую работу па вывучэнні сітуацыі на месцах. Удзельнікам пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання і ўсім зацікаўленым рэкамендавана да 15 жніўня 2018 года накіраваць у Савет Рэспублікі ўсе прапановы з мясцаў па ўдасканаленні рэгіянальнай палітыкі, уключаючы пытанні эканомікі і фінансаў, карэкціроўкі заканадаўства, паляпшэння адміністрацыйна-тэрытарыяльнай будовы з улікам перспектыў развіцця рэгіёнаў, дынамікі колькасці насельніцтва, канцэнтрацыі вытворчых сіл і г. д. — для выпрацоўкі адпаведных прапаноў па пытаннях павышэння эфектыўнасці сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў.

> Гаварыць сумленна і адкрыта пра набалелыя праблемы — першапачатковая зададзеная танальнасць удзельнікаў усіх пасяджэнняў Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання.

У Год малой радзімы мы павінны запусціць механізм устойлівага развіцця тэрыторый. Для гэтага неабходна ў першую чаргу павысіць эфектыўнасць работы эканомікі шляхам прыцягнення інвестыцый у прамысловасць і сельскую гаспадарку, забяспечыць занятасць насельніцтва і тым самым стварыць умовы для высокага ўзроўню жыцця людзей. Ад таго, як яны будуць рэалізаваны ў асобна ўзятым пасёлку, раёне, вобласці, залежыць паспяховае развіццё ўсёй краіны ў цэлым.

**Наталля БІТЭЛЬ.**

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

## Навука быць гаспадарамі

**Краснапольшчына летась далучылася да праекта «Мэры за эканамічны рост» і зараз актыўна працуе над магчымасцю павысіць дабрабыт і якасць жыцця насельніцтва на мясцовым узроўні. У складзе каманды, якая нядаўна наведала штаб-кватэру гэтага праекта ў Тбілісі, пабываў і начальнік аддзела па адукацыі, спорту і турызме Краснапольскага райвыканкама, дэпутат раённага і абласнога Саветаў, адзін з актыўных удзельнікаў праектнай дзейнасці Сяргей СЫРАНКОЎ. Трэнінг датычыўся развіцця мясцовых турыстычных брэндаў і прыцягнення ў раён інвестыцый. Прыкладамі міжнароднага вопыту дзяліўся эксперт з Германіі.**

— Гэта была вельмі карысная для нас вучоба, — кажа Сяргей Сыранкоў. — Ад вобласці ў Грузіі пабывалі таксама спецыялісты з Чавус, Мсціслава, Слаўгарада і Быхава. Мне асабіста было цікава азнаёміцца з методыкай вядзення перагавораў з патэнцыйнымі інвестарамі, навучыцца ствараць тэматычныя праграмы, даведацца, як лепей сябе падаць, як пераканаць суразмоўніка. Гэта ўсё вельмі важныя моманты ў рабоце з прадпрымальнымі людзьмі.

Да праектнай дзейнасці з прыцягненнем замежных інвестыцый Краснапольшчына далучылася ўсяго чатыры гады таму. Дзякуючы створанаму тут мясцоваму фонду развіцця «Старт-Узыход» і непасрэдна яго дырэктару Мікалаю Лістападаву на тэрыторыі Горскага і Яноўскага сельсаветаў сёння дзейнічаюць эксперыментальныя пляцоўкі, дзе людзі вучацца займацца арганічным земляробствам і вырошчваюць чыстую прадукцыю. Сёлета атрымаў працяг самы першы праект, рэалізаваны ў 2014 годзе на базе Пачапоўскага дзіцячага садка — сярэдняй школы «Зялёная эканоміка сада для адраджэння вёскі (дрэвы супраць беднасці і дэградацыі зямлі)». У межах другога праекта «Зялёная эканоміка сада — рэінвеставанне ў развіццё вёскі» (бюджэт праекта склаў больш за 50 тысяч долараў) атрымалася ўзмацніць патэнцыял Пачапоўскага гадавальніка, закласці матачнік клонавых прышчэп, цяпліцы і пасадзіць дэкаратыўны кветнік.

— Акрамя гэтага, была набытая спецыяльная тэхніка для работы ў гадавальніку і закладзены сад плошчай 2,5 гектара на тэрыторыі раёна, — удакладняе Сяргей Сыранкоў. — У будучыні плануем пашырыць яго да чатырох гектараў. На базе Пачапоўскай школы створаны мясцовы цэнтр па навучанні насельніцтва навыкам садаводства і падрыхтаваны трэнер, які ім усё гэта выкладае. Больш таго, мы ўжо выкарысталі свой вопыт у найбліжэйшых паўднёва-ўсходніх раёнах. Аналагічныя гадавальнікі з'явіліся ў Лабанаўцы Чэрыкаўскага раёна і Мілаславічах Клімавіцкага раёна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# РУКА НА ПУЛЬСЕ...

**У прынцыпе, формы работы дэпутатаў з выбаршчыкамі тыповыя: ад сустрэч падчас дзён вёсак, наведвання прадпрыемстваў і гаспадарак да прамых ліній, індывідуальнага прыёму. У розных раёнах мерапрыемствы, зразумела, маюць асаблівасці. Як канкрэтныя дэпутаты мясцовай прадстаўнічай улады працуюць у Лёзненскім раёне? Гэтым пацікавіўся наш карэспандэнт.**

## Не толькі як да медыка

Да народнай абранніцы Алены Баранковай, дэпутата адначасова Лёзненскага сельскага і раённага Саветаў, мясцовыя жыхары часта прыходзяць напрамую ў ФАП, што ў аграгарадку Пушкі. Там яна працуе загадчыцай, а паралельна... вывучае праблемы людзей як дэпутат падчас дыспансерызацыі, якая праводзіцца штогод па два разы.

— Так. Не толькі даследую стан здароўя, але і абавязкова пацікаўлюся тым, што турбуе акрамя яго. Я дэпутат параўнальна вопытны, бо працую ўжо другое скліканне запар, прадстаўляю інтарэсы каля 440 выбаршчыкаў, — расказвае жанчына.

На яе погляд, ёсць нямала годных людзей у раёне, якія маглі б таксама атрымаць мандаты даверу. Але мясцовыя жыхары даручылі прадстаўляць свае інтарэсы ў сельскім і раённым «парламентах» менавіта ёй. Чаму? Напэўна, таму, што знаходзіцца яна ў «крокавай даступнасці». Людзі ведаюць, калі Баранкова прымае пацыентаў у ФАП, адпаведна, і нумар працоўнага тэлефона. Так што многія прыходзяць, каб агучыць і жыццёвыя праблемы. Да таго ж у раённай газеце друкуецца анонс прамых ліній дэпутатаў — праводзяцца яны ў кожную другую сераду месяца.



Другая справа — дэпутат Алена БАРАНКОВА.

## Ад меліярацыі да газіфікацыі

Пытанні, якія патрабавалі рашэння, паводле слоў дэпутата, былі самыя розныя. І дарэчы, часцей за ўсё іх рашэнне не патрабавала фінансавых выдаткаў.

Напрыклад, папрасілі людзі пачысціць меліярацыйны канал у Пушках. Засмечваецца вада, ды і падступаць стала да хляўоў бліжніх дамоў. Алена Сяргееўна давяла праблему да адказных у Лёзне, і тыя зрабілі неабходнае.

Дапамагла Баранкова актывізаваць працэс і па газіфікацыі Пушкоў — гэта ўжо запісана ў адпаведным плане на наступны год.

Папрасілі людзі ліквідаваць несанкцыянаваную звалку — на тым месцы цяпер ідэальны парадак.

Калі ж дэпутат пачула нараканні на дрэнную сувязь ад абанентаў МТС, звярнулася ў кампанію. Спецыяліст заявіў, што пастараюцца зрабіць усё магчымае, але растлумачыў, што цяжка дабіцца ідэальнай якасці, бо побач мяжа з Расіяй. Ды і фактычна ў некаторых месцах толькі ў роўмінгу можна пагаварыць. Але ў выніку, паводле слоў суразмоўніцы, мабільная сувязь стала лепшая...

А аднойчы людзям падалося, што вада ў калодзежы не зусім якасная. Народная абранніца выклікала на месца прадстаўнікоў цэнтра гігіены і эпідэміялогіі. Высветлілася, што ваду ўсё ж можна выкарыстоўваць без дрэнных наступстваў.

— Індывідуальныя просьбы таксама стараюся выканаць. Аднаму выбаршчыку паспрыяла, каб мог дровы нарыхтаваць, а іншай — каб брыкет прывезлі. Звярталася да кіраўніцтва гаспадаркі, каб своечасова аказалі людзям дапамогу, калі ўраджай саспеў, — кажа дэпутат.

Цяпер вось збіраюць грамадой грошы на будаўніцтва царквы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** падкрэсліў, што пра формы работы дэпутатаў з выбаршчыкамі можна расказваць як пра сістэмную дзейнасць, у прыватнасці, пастаяннымі сталі прыёмы грамадзян на прадпрыемствах. Ды і ў абласны Савет людзі сталі часцей звяртацца. Такім чынам вырашаецца нямала праблем.

— Гэта гаворыць аб тым, што дэпутаты сёння маюць вагу і сапраўды праводзяць сур'ёзную працу, — канстатаваў Уладзімір Цярэнцьеў.

# КРОК ДА САМАСТОЙНАСЦІ

## Аб чым сведчыць вопыт работы першай у краіне асацыяцыі мясцовых Саветаў

**ПЕРШАПРАХОДЦАМІ новай арганізацыі сталі гродзенцы. З ініцыятывай выступіў абласны Савет дэпутатаў. Ідэю падтрымалі. І вось ужо некалькі гадоў, як новая структура імкнецца садзейнічаць станаўленню і развіццю мясцовага самакіравання. Якія канкрэтныя задачы ставіць перад сабой асацыяцыя і што ўдалося зрабіць за гэты час? Сваімі разважаннямі дзеліцца старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Ігар ЖУК.**



Фота Міхаіла ІСАЧАНКІ.

**— Ігар Георгіевіч, чым адрозніваецца асацыяцыя ад прыватных тэрытарыяльных дэпутацкіх структур?**

— Тым, што ў яе склад уваходзяць прадстаўнікі ўсіх узроўняў — ад базавага да абласнога. Асацыяцыя аб'ядноўвае іх у адну юрыдычную структуру, кожны член якой можа прадстаўляць інтарэсы ўсёй арганізацыі.

**— Ці важна, каб асацыяцыя была шматлікай?**

— У арганізацыі зараз больш за 400 чалавек — гэта амаль трэцяя частка ўсяго дэпутацкага корпусу. У склад яе ўваходзяць прадстаўнікі абласнога, гарадскога, 10 раённых і 38 сельскіх Саветаў. Асацыяцыя адкрыта для кожнага дэпутата і будзе абнаўляцца, бо дэпутацкі корпус таксама абнаўляецца.

**— Як увогуле ўзнікла ідэя стварэння асацыяцыі?**

— Асацыяцыя была створана ў адпаведнасці з законам «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні». Мы першыя ў рэспубліцы гэта зрабілі. У свеце ж такіх аб'яднанняў органаў мясцовага самакіравання вельмі шмат — і ў Польшы, і ў Францыі, і ў Германіі, і яны паміж сабой супрацоўнічаюць. Нам хацелася б таксама да гэтага далучыцца.

**— Ваша галоўная задача — выйсці на міжнародны ўзровень?**

— У першую чаргу мы павінны садзейнічаць станаўленню і развіццю менавіта мясцовага самакіравання. Выхад на міжнародны ўзровень — адзін з інструментаў гэтай палітыкі. Праз асацыяцыю лягчэй знайсці кантакт з прадстаўніцтвам замежных краін.

**— Якім вы бачыце міжнароднае супрацоўніцтва?**

— Удзел у розных форумах, дзе можна пазнаёміцца з вопытам работы грамадскіх арганізацый мясцовага самакіравання. Наладзіць кантакты з нашымі найбліжэйшымі суседзямі — палякамі і літоўцамі, а таксама з усімі, каму гэта будзе цікава. Такія сувязі зробяць магчымым удзел у розных міжнародных праектах, у тым ліку трансгранічных. Гэта прыярытэтны кірунак. Асацыяцыя — больш аўтарытэтны партнёр, бо прадстаўляе інтарэсы дэпутатаў усіх узроўняў.

**— Ці значыць гэта, што асацыяцыя можа зарабляць сродкі?**

— Так, мы на гэта накіраваны. Лічу, што ў будучым гэта стане нашай асноўнай крыніцай дахода. Праз праекты асацыяцыя можа атрымаць з розных фондаў матэрыяльную падтрымку для рэалізацыі сацыяльна значных для нас праектаў. Зараз мы жывём за кошт узносаў членаў асацыяцыі, спонсарскай дапамогі.

**— Можа, ёсць ужо вопыт удзелу ў такіх праектах?**

— Першы вопыт ёсць. Летась мы з фондам імя Сапегі распрабавалі ўдзельнічаць у праекце трансгранічнага супрацоўніцтва, разам з намі партнёрам выступала італьянская асацыяцыя мясцовага самакіравання. Мы прайшлі першы этап, але на другім праект не быў падтрыманы. Будзем улічваць тыя недапрацоўкі і шукаць іншых партнёраў. Пакуль мы ў самым пачатку шляху.

**— У чым сутнасць праекта?**

— Мы распрацавалі такія канцэптуальныя падыходы, якія дапамаглі б узняць статус мясцовага самакіравання. Якія крокі трэба зрабіць, каб на месцах больш эфектыўна вырашаліся пытанні, якія хвалююць людзей, бо дэпутаты не заўсёды маюць магчымасць нешта зрабіць.

Нам трэба пазбегнуць такіх падыходаў, якія раней былі звыклай справай і зараз таксама яшчэ практыкуюцца. Маецца на ўвазе дапамога мясцовых сельгаспрадпрыемстваў. З пункту гледжання партнёрства гэта не дрэнна, але з прававога гледзішча — далёка не ўсё правільна. Бо раней гэта былі СВК — па сутнасці прыватная структура, кааператыў, яны маглі калектыўна прыняць рашэнне адрамантаваць вуліцу, нешта добраўпарадкаваць і свае грошы маглі на гэта накіраваць. Зараз гаспадаркі сталі дзяржаўнымі ўнітарнымі прадпрыемствамі, і калі яны накіруюць сродкі на добраўпарадкаванне вёскі, гэта будзе нямэтавае выкарыстанне. Таму нам важна накіраваць органы мясцовага самакіравання на тое, каб яны зараблялі сродкі для бюджэтаў папаўнення.

**— Якія ёсць магчымасці для гэтага?**

— Будзем стымуляваць членаў нашай асацыяцыі, мясцовыя органы самакіравання на ўдзел у праектнай дзейнасці. Бо не ўсе мясцовыя Саветы могуць зарабіць праз продаж зямельных участкаў, нявыкарыстанага жылля, арэнды зямлі і нерухомасці. У гэтым больш шанцуе ўладам сельсаветаў, якія знаходзяцца блізка ад гарадоў. А калі больш аддаленыя месцы? Ім зарабіць грошы складаней. Дарэчы, і замежныя нашы суседзі казалі, што ім грошай з бюджэту выдзяляецца няшмат, асноўны іх даход — праектная дзейнасць. Мы таксама на гэта накіраваны. У нас былі прадстаўнікі асацыяцый з Польшчы, мы пазнаёміліся і зараз будзем вырашаць, што можам зрабіць разам.

**— Ёсць яшчэ якія-небудзь магчымасці актывізаваць работу мясцовых Саветаў?**

— Мне падаецца важным стварыць фонд мясцовых ініцыятыў. Такая прапанова была агучана мной на форуме рэгіёнаў Расіі і Беларусі. Можна пачаць з абласнога ўзроўню. І, я думаю, мы зможам гэта зрабіць. Тады старшыні нашых сельскіх Саветаў на конкурснай аснове будуць удзельнічаць і атрымліваць пэўныя гранты для рэалізацыі сваёй ініцыятывы.

**— Свайго роду трэніроўка для ўдзелу ў міжнародных праектах?**

— Такім чынам будзем стымуляваць праектную дзейнасць. А калі мы будзем padштурхоўваць членаў асацыяцыі на ўзроўні вобласці, у іх з'явіцца азарт і да ўдзелу ў трансгранічных праектах. У вобласці з кожным годам колькасць такіх заявак павялічваецца, канешне, не ўсе, але трэцяя частка праходзяць конкурсны адбор, а гэта пазабюджэтныя сродкі, якія дазваляюць зрабіць добрую справу. Лічу, што імідж такога кіраўніка адразу вырасце. Бо ўсе будуць бачыць, што зроблена нешта канкрэтнае.

**— Ці важна прыцягваць да гэтага насельніцтва?**

— Вопыт кожнай дзяржавы паказвае, што мясцовае самакіраванне, калі яно эфектыўна працуе, — гэта вялікі плюс, і людзі павінны разумець, што асноўныя пытанні трэба вырашаць на месцах, а не адрасаваць іх у сталіцу і вобласць. Мясцовая ініцыятыва — гэта вельмі важна, людзі павінны ўдзельнічаць і ў навядзенні парадку, і добраўпарадкаванні.

> Нам трэба пазбегнуць такіх падыходаў, якія раней былі звыклай справай і зараз таксама яшчэ практыкуюцца. Маецца на ўвазе дапамога мясцовых сельгаспрадпрыемстваў.

**— Што зроблена асацыяцыяй за гэты год?**

— Мы стварылі палажэнне аб конкурсах, каб падтрымаць старастаў і органы тэрытарыяльнага самакіравання. Правялі конкурс, узнагародзілі, купілі каштоўныя падарункі — бензакасілкі. Бо сам сельсавет купіць нічога не мае права. Згодна з бюджэтным кодэксам гэта забаронена. Таму многія дэпутаты разумеюць, што трэба на праекты звяртаць увагу.

**— Ці трэба ствараць такія асацыяцыі паўсюдна?**

— Закон аб мясцовым самакіраванні дазваляе гэта зрабіць, і адна з мэт, якая была агучана старшынёй Савета Рэспублікі Міхаілам Мясніковічам, — стварэнне нацыянальнай асацыяцыі мясцовых Саветаў. Гэты артыкул нерэалізаваны, але мы па такім шляху ідзём.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Юрый ГРОЕРАЎ:

# «АЎТАРСКАЕ "Я" — ТОЛЬКІ ЧАСТКА ВЯЛІКАЙ КАМАНДЫ»

**Гледачы «са стажам» помняць Юрыя Гроерава яшчэ па выпусках «Панарамы», куды вядучы трапіў з Магілёўскай абласной ТРК. Потым была праца ў тэлерадыёвяшчальнай арганізацыі Саюзнай дзяржавы, а з канца мінулага года Гроераў вядзе на АНТ інфармацыйна-аналітычную праграму «Контуры». Акрамя таго, ужо больш як дзесяць гадоў менавіта яго голасам гучыць вайсковы парад у Дзень Незалежнасці — не выключэннем стане і цяперашні.**



**Даведка «Звязды»**

*Стваральнікі «Контураў» вызначаюць жанр праграмы як «інфармацыйны арт», у якім арганічна спалучаюцца аператыўныя рэпартажы з падкрэсленай аўтарскай пазіцыяй і смелыя рэжысёрскія рашэнні. Журналісты службы навін АНТ малююць агульную інфармацыйную карціну мінулага тыдня, а госці праграмы ў студыі больш падрабязна каментуюць адну з тэм, якія прагучалі ў выпуску.*

***— Крыху больш як паўгода вы ў камандзе «Контураў». Ці складана было прыйсці ва ўжо дзейны рэйтынгавы праект і падладзіцца пад існуючы фармат?***

— Адназначна не адкажаш. З аднаго боку, было проста, бо хапае асабістага вопыту вядзення разнастайных праграм, у тым ліку і падобнага кірунку. Да таго ж і ў праекце, і наогул у інфармацыйнай дырэкцыі АНТ насамрэч падабралася выдатная прафесійная каманда, з якой мне вельмі камфортна працаваць. Што да складанасцяў... Мабыць, яны ў тым, што ў сферы тэлебачання вельмі цяжка вынайсці нешта новае: усё ўжо было калісьці, усе тэмы так ці інакш паўтараюцца. Але тым цікавей пастарацца знайсці новы падыход, іншы ракурс.

## Контурная лінія

***— «Контуры» грунтуюцца на аўтарскіх сюжэтах пра самыя яркія падзеі тыдня. Ці плануецца нешта змяняць у праграме, дадаваць больш суб'ектывізму ці, наадварот, «чыстай» інфармацыі?***

— Насамрэч штосьці змяняецца ў кожным выпуску: мы стараемся праяўляць фантазію ў формах падачы інфармацыі. І, на мой погляд, сапраўды атрымліваецца шторас знаходзіць які-небудзь нечаканы элемент, які аздабляе сюжэт і робіць праграму больш яркай, запамінальнай.

***— Вам бліжэй падкрэслена аўтарская, суб'ектыўная падача матэрыялу альбо «сечаны», дакладны інфармацыйны стыль?***

— Тут ведаеце, якая штука... Кожны тэкст, які чытае кожны вядучы, нават з тых, каго называюць «гаваркая галава», усё адно прапускаецца праз сябе, і ў ім прысутнічае элемент суб'ектыўнага погляду. Але аўтарскае «я» — усяго адна са шматлікіх частак вялікай каманды. Калі нехта скажа, маўляў, я раблю праграму — гэты чалавек, мякка кажучы, хітруе, а часцей хлусіць. Тэлебачанне — такі калектыўны від мастацтва, дзе адзін чалавек не можа зрабіць нічога. Вядучы, якога гледачы бачаць у кадры, — толькі вяршыня айсберга з неабсяжнай падводнай часткай. І вынік іншым разам залежыць ад такіх дробязяў, што цяжка ўявіць. Часам важна нават тое, каб прыбіральшчыца правільна памыла падлогу, не кажучы ўжо пра тое, каб аператар зняў прыгожа, а грымёр стварыў прывабны выгляд. Таму, канешне, аўтарскі погляд на ўзнятыя тэмы ў мяне ёсць, але перацягваць коўдру на сябе — ніколі гэтага не рабіў і не збіраюся, бо, паўтаруся, годны вынік атрымаецца толькі тады, калі ўсе ўдзельнікі каманды спрацуюць добра.

***— Ваш прафесійны вопыт ахоплівае некалькі тэлерадыёкампаній, але прытым вы ўвесь час працуеце ў грамадска-палітычных праграмах. Гэта таму, што блізкая тэма?***

— Гэта таму, што мне цікавае жыццё ва ўсіх яго праявах і навакольныя людзі. І я ўдзячны праграме «Контуры», дзякуючы якой маю магчымасць калі не штодня, то штотыднёва кантактаваць з вельмі цікавымі людзьмі, прафесіяналамі з розных сфер, увесь час даведвацца штосьці новае і ўзбагачаць свой жыццёвы досвед. Дасць бог, мне яшчэ доўга будзе ўсё гэта цікава.

## Парадны разлік

***— Вас ужо амаль афіцыйна прадстаўляюць як «голас парада». Памятаеце, калі ўпершыню давялося каментаваць ваенны парад і ўрачыстае шэсце на Дзень Незалежнасці?***

— У 2004 годзе. Гэта, дарэчы, якраз быў першы парад, які праходзіў не на праспекце Францыска Скарыны (цяперашнім праспекце Незалежнасці), а каля стэлы «Мінск — горад-герой». З таго часу даводзілася працаваць і аднаму, і ў пары з суведучымі — апошнім часам найчасцей з Вікторыяй Сянкевіч, за што ёй вялікі дзякуй.

**«З горам папалам літаральна за 10 хвілін да пачатку трансляцыі дабраліся да сваёй каментатарскай пазіцыі — пасівелі, мабыць, усе, хто чакаў нас у перасоўных тэлестанцыях».**

***— У тандэме працаваць зручней?***

— Натуральна, бо пры вонкавай прастаце каментавання не такая ўжо гэта простая справа. Калі ваенная частка парада доўжыцца каля гадзіны, а ўвесь гэты час твае галасавыя звязкі не маюць часу на адпачынак, то пры наяўнасці партнёра можна дазволіць сабе хоць бы выключыцца на хвілінку мікрафон і проста адкашляцца, прачысціць горла. З Вікторыяй у нас існуе ўмоўны падзел: ваенную частку каментую я, больш «лірычнае» святочнае шэсце — перавважна яна.

***— Голас парада — місія пачэсная, але і адказная. Як, уласна, беражаце голас?***

— Шчыра скажу, нічога звышасаблівага не раблю. Напэўна, дзякуй маме, тату і прыродзе за вынослівыя звязкі. Хоць, канешне, з вялікай удзячнасцю і цеплынёй згадваю і свайго настаўніка Алега Васілевіча Хлыстова — гэта адзіны ў Магілёўскай вобласці дыктар найвышэйшай, усесаюзнай катэгорыі, які вельмі шмат мне расказаў і паказаў, як правільна карыстацца голасам як працоўным



інструментам, каб умець у час напружвацца і расслабляцца. А ў астатнім — напрыклад, не ўжываю газіроўкі, пазбягаю перад працай ежы, якая раздражняе звязкі. У прынцыпе, выконваю тыя самыя рэкамендацыі, што і вакалісты, прамоўцы і ўсе іншыя, для каго голас — частка прафесіі.

***— Словам, калі запытаюся, ці здараліся ў вас казусы з голасам у самы адказны момант, адкажаце адмоўна?***

— З голасам, цьфу-цьфу, нічога не здаралася. Максімум прастуджваўся, але нават у такім стане я ведаю, што рабіць, каб у трансляцыі ўсё гучала як след.

***— А наогул форс-мажоры «за кадрам» парада былі?***

— Напэўна, самы сур'ёзны з іх ледзьве не здарыўся, калі парад упершыню праводзілі вечарам. Мы з суведучай якраз пад'язджалі да месца, але ніхто не чакаў, што будзе такое неабсяжнае людское мора: напрасту не атрымлівалася прайсці праз натоўп да перасоўнай тэлестанцыі, каб пачаць працу. Ведаеце, гэта такое адчуванне — як мора калышацца, так і мы ў ім, бы на хвалях, прыціскаючы да сябе тэксты, ледзь-ледзь можам зрабіць крок наперад. Нейкім цудам удалося ўсё ж працінуцца да ачаплення, у якім стаялі курсанты. Пакуль знайшлі старшага, растлумачылі, у чым справа, з горам папалам літаральна за 10 хвілін да пачатку трансляцыі дабраліся да сваёй каментатарскай пазіцыі — пасівелі, мабыць, усе, хто чакаў нас у перасоўных тэлестанцыях, бо вядучых зніклі дзесьці ў шматтысячным натоўпе, а датэлефанавацца да нас ніхто не мог, сувязь не «лавілася» наогул... Цяпер згадваць гэта забаўна, але ў той момант перахвалялваліся мы істотна.

Што да самога парада, у ім столькі разоў рэпецірюуюцца і падганяюцца ўсе элементы, так што непрыемных сюрпрызаў тут не бывае — дзякаваць богу, танкі ў нас пасярод праспекта не глухнуць (у 2015-м на Краснай плошчы ў Маскве падчас генеральнай рэпетыцыі парада заглух танк «Армата». — **Аўт.**). Хіба што, бывае, крыху раней часу прылятае авіяцыя альбо, наадварот, затрымліваецца, і тады трэба запоўніць паўзу ў трансляцыі.

***— Нярэдка даводзіцца чуць, што парад — перажытак савецкага часу і, маўляў, навошта рабіць кожны год адно і тое ж...***

— Парад сам па сабе — мерапрыемства класічнае і даволі кансерватыўнае. І гэта датычыцца не толькі нашай краіны. Узяць, напрыклад, Расійскую Федэрацыю альбо Францыю ці Вялікабрытанію, дзе парад адбываецца ў дзень нараджэння каралевы: у кожнай з гэтых краін ёсць пэўныя традыцыі, якія не змяняюцца дзесяцігоддзямі. Так, у сучасным свеце ўжо даўно не выкарыстоўваюць для ваенных дзеянняў коней, але ў той жа Францыі і Англіі ўсе з задавальненнем назіраюць, як велічна ў парадзе ідзе конніца і як эфектна выглядаюць знакамітыя футравыя шапкі брытанскай каралеўскай гвардыі. У Беларусі, магчыма, няма такіх глыбокіх ваенных традыцый, бо сама наша дзяржава вельмі маладая. Затое мы з вамі — сведкі таго, як гэтыя традыцыі нараджаюцца, усталёўваюцца ў грамадскай свядомасці. І мне асабіста вельмі цікава, якім будзе парад у Мінску праз 50 гадоў. Хацелася б, магчыма, каб у гэтым прыгожым святочным мерапрыемстве прысутнічала не толькі савецкая гісторыя, але і пэўныя нацыянальныя адметнасці, той каларыт, які адразу вылучаў бы беларускі парад сярод усіх іншых. Упэўнены, што так і будзе з цягам часу. Усё ж, як гаварыў адзін вялікі брытанскі адмірал, трэба тры гады, каб збудаваць карабель, і 300 гадоў, каб утварыць на флоце традыцыю.

## План на заўтра

***— Лета — традыцыйна адпускны сезон. У вас якія планы?***

— Гэтым летам «Контуры» ў адпачынак не ідуць, адпаведна, і я таксама. А ўжо восенню хачу паспрабаваць паўтарыць адзін маршрут — неяк даўно мы з прыяцелем даехалі на машыне да Сардзініі, і гэта быў насамрэч незабыўны вопыт. Не, я не супраць турэцкага all inclusive, гэты фармат цудоўна падыходзіць сем'ям, калі трэба даць адпачыць і дзецям, і бацькам. Аднак для самастойнага адпачынку выбіраю менавіта такі, па-за межамі раскручаных турыстычных месцаў. Калі хочаце не ўбачыць прыгожую глянцавую паштоўку, а зразумець, чым насамрэч жыве тая ці іншая краіна — збочвайце з аўтабана, заязджайце ў глыбінку і ідзіце туды, куды ідуць мясцовыя жыхары.

***— А чаму менавіта Сардзінія, чым прывабіў гэты рэгіён?***

— Па-першае, там жыве мой добры сябар — ганаровы консул Беларусі ў Кальяры Джузэпэ Карбоні. Мы адразу, калі толькі пазнаёміліся некалькі гадоў таму, адчулі вялікую прыязнасць і з таго часу падтрымліваем цёплыя стасункі. Дарэчы, мала хто гаворыць пра гэта, але аўтаномны рэгіён Сардзінія — на сёння адзіны ў Еўропе, дзе прыняты і дзейнічае закон аб супрацоўніцтве з Беларуссю! Па-другое, каб закахацца ў Сардзінію, дастаткова пабываць там і пазнаёміцца бліжэй з мясцовымі. Заходзіш у краму ўпершыню — з табой проста вітаюцца, другі раз — прымаюць як сябра, распытваюць, як справы, а на трэці — усё, лічышся родным і блізкім чалавекам. Ну і, відавочна, поўдзень Італіі — гэта ўнікальная прырода, казачныя краявіды і крышталёвае чыстае мора, прычым за чысцінёй мора і паветра на Сардзініі пільна сочаць і робяць усё, каб зберагчы свае прыродныя багацці... Словам, расказаў вам пра гэта і адчуў, як мяне зноў цягне ў гэтыя мясціны.

***— Тады плённага лета, а ўвосень няхай усё атрымаецца!***

Гутарыла **Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

*Фота тэлеканала АНТ і з асабістага архіва вядучага.*


**Рыхтуй бочкі летам! Са «Звяздой»!**

А яшчэ, адзначыла старшыня сельскага Савета, узвядзенне і абсталяванне гэтай пляцоўкі паўплывала на агульную атмасферу жыцця ў пасёлку. Людзі лепш пазнаёміліся, пасябравалі, цяпер больш камунікуюць паміж сабой. На Новы год, не згаворваючыся, выйшлі сюды, каб павіншаваць адно аднаго са святам. Пляцоўка стала галоўным грамадскім цэнтрам. Тут, відаць, і вырашылі, што трэба ачысціць забалочаны ўчастак па вуліцы Новай і ператварыць яго ў культурны вадаём. Вопыт ёсць, так што вясной зноў узяліся за справу. Знайшлі тэхніку, ачысцілі ранейшую не то яму, не то равок, прыбралі бур'ян навокал. Атрымаўся невялікі прыгожы вадаём. Потым запусцілі туды малька рыбы — хутка будзе і рыбалка. Сельвыканкам купіў сетку, жыхары паставілі агароджу. Ужо набылі насенне травы, пасля дажджу можна будзе пасеяць і акультурыць бераг.



Старшыня сельскага Савета дэпутатаў Святлана ГАНГАЛА і старшыня раённага Савета дэпутатаў Іван ДАЎЖУК.

А далей у планах жыхароў Птушкафабрыкі побач з пляцоўкай узвесці сцэну, каб можна было праводзіць дзень пасёлка ці іншыя святы з запрашэннем самадзейных артыстаў. Не сумняваюся, што гэта ў іх атрымаецца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Іван ДАЎЖУК, старшыня Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў:**

— У пасёлку Птушкафабрыка мы маем цудоўны прыклад, калі атрыманы з дапамогай дэпутацкай ініцыятывы грант стаў штуршком для развіцця грамадскага самакіравання. Людзі зразумелі, што яны многае могуць зрабіць самі для паляпшэння якасці жыцця. І здзейснілі гэта. Самае галоўнае, што рэалізацыя адной ініцыятывы стала трамплінам для другой.

# ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

## Усе формы работы добрыя. Асабліва тыя, што прыносяць вынікі

**Дэпутат — абраннік народа, людзі чакаюць, што з яго дапамогай іх жыццё будзе мяняцца да лепшага, стане больш камфортным і ўладкаваным.**

— І мы проста не можам не апраўдаць іх спадзяванні, — кажа **старшыня Барысаўскага раённага Савета дэпутатаў Пётр НАВІЦКІ.** — У нашым дэпутацкім корпусе 17 жанчын і столькі ж мужчын. Гэта нераўнадушныя, крэатыўныя, творчыя людзі, якія выкарыстоўваюць розныя формы работы і зваротнай сувязі з насельніцтвам.

Напрыклад, кожную другую сераду месяца ладзяцца сустрэчы з выбаршчыкамі з выездам на месца. У іх прымаюць удзел дэпутаты Мінскага абласнога, раённага, а таксама сельскіх Саветаў. У раёне налічваецца 12 сельсаветаў. Кожны з іх атрымлівае наведвацца раз на месяц. Акрамя таго, у раёне дзейнічае сем інфармацыйна-прапагандысцкіх груп, якія ўзначальваюць старшыня райвыканкама, яго намеснікі і старшыня райсавета — туды ўваходзяць таксама дэпутаты абласнога і раённага Саветаў. Людзей папярэджваюць аб мерапрыемстве загадзя, інфармацыю размяшчаюць на сайце райвыканкама, у населеных пунктах сельсавета. На сустрэчу запрашаюцца і спецыялісты адпаведных службаў, якія могуць даць кампетэнтныя адказы, акрэсліць шляхі рашэння той ці іншай праблемы.

— У Мінскай вобласці ўжо некалькі гадоў запар праводзяцца дні дэпутата. У якім фармаце праходзяць яны ў вашым раёне?— пацікавілася карэспандэнт «МС».

— Разам з дэпутатамі, старшынямі сельвыканкамаў вывучаем надзённыя патрэбы, пажаданні выбаршчыкаў і на пэўны дзень прызначаем сустрэчу ў канкрэтным сельсавеце. З сабой бяром прадстаўнікоў розных службаў. Напрыклад, калі ёсць пытанні па рабоце гандлю, запрашаем старшыню райспажыўсаюза або спецыяліста аддзела гандлю і паслуг райвыканкама. У кожным населеным пункце пытанні розныя: дзесьці людзі наракаюць на гандлёвае абслугоўванне, дзесьці — на незадавальняючае дарожнае пакрыццё, транспартныя зносіны. Тыя пытанні, якія ў маёй кампетэнцыі, з улікам вопыту работы вырашаю сам. Не магу не сказаць і аб тым, што ў раёне не першы год складаецца графік правядзення свят вёсак. Папярэдне парадкуем населены пункт усёй грамадой: прадпрыемствы, арганізацыі, дэпутаты, грамадскія арганізацыі. Агульныя высілкі дазваляюць прывесці вёску ў належны стан. А для саміх жыхароў такія святы — магчымасць адпачыць, павесяліцца, больш даведацца аб жыцці сваіх землякоў, гісторыі краю. Падчас свята не забываем літаральна ніводнага чалавека: віншуем і ўручаем падарункі самым пажылым і самым маленькім жыхарам, перадавікам, гаспадарам за самае лепшае ўтрыманне падворкаў. Ладзяцца шматлікія конкурсы, віктарыны, канцэрты.



Пётр НАВІЦКІ: «Хто не памятае гісторыі сваёй Айчыны, той не мае будучыні».

Дэпутаты і старшыня райсавета дзейнічаюць па прынцыпе «хто не памятае гісторыі сваёй Айчыны, сваёй малой радзімы, у таго няма будучыні». Апошнія гады яны аднаўляюць і ўладкоўваюць гістарычныя мясціны. Барысаўскі раён стаў арэнай змагання рускіх войскаў з арміяй Напалеона ў 1812 годзе, яго тэрыторыю моцна закранула Вялікая Айчынная вайна — тут налічваецца 156 помнікаў па ўвекавечанні памяці землякоў.

— Да канца 1941 года ў паўночнай частцы раёна пачаў дзейнічаць партызанскі атрад на чале з першым сакратаром Барысаўскага райкама партыі Іванам Апанасавічам Ярашам. Партызаны нечаканымі налётамі, мінiраваннем дарог, узрывамі эшалонаў, засадамі вымотвалі сілы ворага. Мы аднавілі шэсць зямлянак з васьмі ў тым месцы, дзе базіраваўся партызанскі штаб, — кажа Пётр Навіцкі.

Сёлета да 74-й гадавіны вызвалення Барысава ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 916-годдзя з дня заснавання горада плануецца арганізаваць велапрабег па гістарычных мясцінах горада і раёна. Ініцыятары яго — дэпутаты раённага Савета. Згоду на ўдзел далі таксама дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, грамадскіх арганізацый. Ад Вечнага агню будзе запалены факел і па маршруце прабегу на кожным пахаванні ад яго запаляць лампадкі ў памяць землякоў, якія аддалі жыццё за мірную будучыню.

Акрамя таго, усе дэпутаты замацаваны за сем'ямі, дзеці ў якіх знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Народныя абраннікі пры наведванні вывучаюць бытавыя ўмовы пражывання выхаванцаў, уручаюць ім падарункі, пры магчымасці — адзенне. А яшчэ аказваюць падтрымку сем'ям, што выхоўваюць дзяцей з інтэрнатаў. Разам з раённай арганізацыяй РГА «Белая Русь», раённым тэрытарыяльным цэнтрам абслугоўвання насельніцтва наведваюць старажылаў, якім па 100 і больш гадоў. Уручаюць ім каштоўныя падарункі, віншуюць са знамянальнымі датамі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ХОЦІМСКІ ВАРЫЯНТ



Гаспадарка — банкрут, але дэпутаты дапамагаюць ёй выходзіць з крызісу.

**ЛЕТАСЬ хоцімскія дэпутаты вырашылі заняцца маніторынгам тутэйшых аграгаспадарак. І зусім не дзеля таго, каб кагосьці вывесці на чыстую ваду і пакараць. Сэнс у іншым. Такім чынам тут спрабуюць талакой вырашаць пытанні, якія не пад сілу аднаму калгасу. І добрыя вынікі ёсць. Напрыклад, як паведамілі работнікі аграгаспадаркі «Батаева», няма больш затрымак з выплатай заработнай платы.**

## Няма кармоў — няма заробку

**Старшыня Хоцімскага райсавета дэпутатаў Яўген НІКАЛАЕНКА** якраз шэфствуе над ААТ «Батаева». Цэнтральная сядзіба гаспадаркі знаходзіцца ў аграгарадку Бяседавічы. Тут спецыялізуюцца на вытворчасці малака, вырошчванні збожжавых і зернебабовых. На тэрыторыі таварыства знаходзіцца восем жывёлагадоўчых аб'ектаў, тры з якіх — малочнатаварныя фермы. У гаспадарцы працуе ў сярэднім 135 чалавек. Пра тое, наколькі тут складаныя абставіны, сведчыць той факт, што таварыства знаходзіцца ў стадыі банкруцтва.

— З кармамі праблема, фуражу летась было недастаткова, — уздыхае **заатэхнік Людміла ПАПЫРКА.** — У ход ідзе падкормка, сена новага ўраджаю. Сродкаў у гаспадаркі не хапае, усё дарагое. На літр саляркі трэба некалькі літраў малака прадаць. Адкуль грошам узяцца?

Дэпутацкая дапамога, кажа жанчына, адчуваецца. З той жа зарплатай, напрыклад. Затрымкі з ёй няма. А яшчэ старшыня райсавета паклапаціўся, каб была арганізаваная дапамога з будаўніцтвам сіласнай ямы.

— Вельмі своечасовая дапамога, — адзначае **выканаўчы дырэктар гаспадаркі Самвел ДЖАВУКЦЯН.** — Будаўніцтва сянажнай траншэі для захоўвання кармоў ідзе на месцы былой фермы. Дапамагаюць хоцімскія арганізацыі. А наша задача — нарыхтаваць кармы.

— Кадраў на сяле больш не становіцца, — дадае Яўген Нікалаенка. — Раней сваіх людзей у гаспадарцы хапала, а зараз калгаснікі не паспяваюць усё самі рабіць. Але ўдзельнічаем мы толькі ў другарадных справах. Даіць малако або нарыхтоўваць кармы — гэтым павінны займацца спецыялісты. А вось падрыхтаваць ферму да зімы, пабудаваць сянажную яму можа любы чалавек. Калі адцягваць на гэта спецыялістаў, мы страцім самае галоўнае — малако і кармы. А без малака не будзе і заработнай платы.

## Талакой прасцей

Пляцоўка для будаўніцтва сянажнай траншэі ўжо



Старшыня Хоцімскага райвыканкама Дзмітрый РУБАН.

гатовая. Каб танней было, яе ствараюць на месцы старога кароўніка. Падмурак і сцены ўжо ёсць. Кармы — канюшына і кукуруза — у крокавай даступнасці. Сянажная траншэя дапаможа захаваць якасць кармоў, што, у сваю чаргу, паўплывае на якасць малака, яго аб'ём, на здароўе жывёлы. У разборцы старой пабудовы, дарэчы, прымалі ўдзел леснікі, супрацоўнікі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Хоцімскага райвыканкама, гарпаліва, ратавальнікі, дарожныя будаўнікі ДРБУ-216. Калі прывязуць грунт і пліты, каб зрабіць дах, работы працягнуцца.

— Да верасня тут павінна быць усё гатова, — кажа выканаўчы дырэктар. — Бурты сёння нельга рабіць на палях, усё павінна быць пад дахам.

На ўборцы кармоў працуе аб'яднаная тэхніка дзвюх гаспадарак — «Ліпаўкі» і «Батаева». «Ліпаўка», дарэчы, таксама банкрут.

— У нас сфарміраваны атрад, каб больш аператыўна прыбіраць кармы, больш якасна і ў тэрміны класці сянажныя ямы,— кажа **антыкрызісны кіраўнік ААТ «Ліпаўка» Мікалай КОКАТАЎ, таксама дэпутат сельскага Савета.** — Заканчваем у «Батаеве», ідзём у «Ліпаўку», і наадварот. Так па чарзе рыхтуем кармы. Як дэпутату, мне важна, каб у людзей была і работа, і зарплата.

## Падставілі плячо

Можна прывесці шмат прыкладаў, як хоцімскія дэпутаты дапамагаюць сельскім гаспадаркам. Дырэктар ПМК № 276 Міхаіл Кошкін, напрыклад, летась падтрымаў падшэфную гаспадарку з рамонтам памяшканняў сельскагаспадарчага значэння. Сіламі гэтага прадпрыемства была забетанавана падлога ў адным з хлявоў. У ПМК для такіх работ ёсць спецыяльныя брыгада і тэхніка.

**Дырэктар «Жылкамунгаса» Сяргей ВІННІКАЎ, таксама дэпутат,** падтрымлівае ААТ «Кастрычнік-Бярозкі», выдзяляе тэхніку для адвозкі кармоў. «Тэлефаную, езджу глядзець, як ідуць справы на сянажнай яме, як працуе тэхніка», — кажа ён .

Быў выпадак, калі на МТФ гаспадаркі выйшаў са строю кацёл, які ацяпляў даільную залу. Зваршчык «Жылкамунгаса» аператыўна наладзіў абсталяванне, працаваў да самай ночы.



Мікалай КОКАТАЎ, Яўген НІКАЛАЕНКА і Самвел ДЖАВУКЦЯНназіраюць за ўтрамбоўкай сенажу.

## Настрой — гэта важна

Да Расіі ад Хоцімска бліжэй, чым да Магілёва. Моладзь, калі не знаходзіць работу дома, з'язджае да суседзяў. Але цесная работа выканаўчай і прадстаўнічай улады па рэанімацыі сваёй раённай эканомікі ўжо дае плады.

— За сельгасарганізацыямі замацаваны і дэпутаты, і члены выканкама, і прафсаюзы. Але наша задача не ўмешвацца ў работу кіраўніка гаспадаркі, не ўказваць яму, калі сеяць, калі ўбіраць. Там ёсць спецыялісты, якія гэта ведаюць лепш за нас, — кажа **старшыня Хоцімскага райвыканкама Дзмітрый РУБАН.** — Наша задача, каб дэпутаты і спецыялісты, замацаваныя за гаспадаркамі, жылі праблемамі людзей, якія там працуюць. Часам дастаткова пагутарыць з калектывам, каб стабілізаваць абстаноўку. Настрой людзей — гэта вельмі важна.

Кіраўнікі гаспадарак могуць арганізаваць работу на сваіх тэрыторыях самастойна, але ёсць моманты, дзе ім падстаўляюць плячо. Хоцімшчына — сельскагаспадарчы раён, таму тут перш за ўсё звяртаюць увагу на сельскую гаспадарку. Кіраўнікі, калектывы разумеюць, што, калі з сельскай гаспадаркай будзе ўсё добра, то будуць і рабочыя месцы, а будуць рабочыя месцы — будзе развівацца і сацыяльная сфера.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ДАЙСЦІ ДА КОЖНАЙ БАБУЛІ

## Дэпутаты Кармянскага райсавета вырашылі паказаць прыклад мясцовым жыхарам

**Сабралі грошы і за гэты кошт замянілі або адрамантавалі абсталяванне на дзіцячых пляцоўках, паставілі і пафарбавалі лаўкі, альтанкі, пясочніцы, горкі... Так, дзякуючы дэпутацкай ініцыятыве, у раёне былі добраўпарадкаваны 12 дваровых тэрыторый.**



Падчас чарговай сустрэчы з мясцовымі жыхарамі.

— Калі мы бачым праблему, заўсёды імкнёмся яе не толькі агучыць, але і вырашыць, — гаворыць **старшыня Кармянскага раённага Савета дэпутатаў Таццяна ШЭХЦЕР.** — Толькі пасля гэтага потым можна будзе нешта патрабаваць ад іншых. Да таго ж, нашы дэпутаты добраўпарадкавалі і тры крыніцы: усталявалі кольцы, каптажы, лаўкі, парэнчы да спуску. Зрабілі зручныя падыходы да вады. Запрасілі святара, які асвяціў крыніцы.

Як і паўсюдна, на Кармяншчыне праходзяць прыёмы грамадзян, дзень дэпутата, дзень сельскага Савета, сесіі, пасяджэнні камісій і прэзідыума... І усё ўрэшце для таго, каб пачуць патрэбы людзей. Жывы дыялог адбываецца штодзённа. У тым ліку там, дзе райсавет арганізоўвае выязныя нарады.

— Мы выбіраем самыя актуальныя тэмы. Спачатку наведваем населеныя пункты пэўнага сельсавета, а потым падводзім вынікі на пленарнай нарадзе. Зусім нядаўна на правялі сесію раённага Савета дэпутатаў, дзе разглядалі работу Кароцькаўскага сельскага Савета па комплексным развіцці тэрыторыі і навядзенні парадку на зямлі. Для гэтага запрасілі да ўдзелу начальніка землеўпарадкавальнай службы Гомельскага аблвыканкама Аляксандра Матараса. Ва ўсіх справах нам вельмі дапамагае актыў — гэта не толькі дэпутаты, але і старэйшыны населеных пунктаў, моладзь. Калі праводзім дні дэпутата, абавязкова наведваем усе вёскі сельсавета. Імкнёмся паразмаўляць літаральна ў кожным доме з кожным жыхаром. Глядзім, як праведзена добраўпарадкаванне, звяртаем увагу на бяспеку жыхароў. Вельмі многа даюць непасрэдныя стасункі. Менавіта так мы даведваемся аб праблемах людзей. А потым ладзім круглы стол, на які запрашаем усіх: старэйшын, дэпутатаў, актыў, моладзь, кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый, якія знаходзяцца на гэтай тэрыторыі.

У Год малой радзімы абвясцілі свой конкурс на стварэнне малых архітэктурных кампазіцый. Таццяна Валянцінаўна расказвае, як моладзь Ворнаўскага сельсавета зрабіла яго візітоўку. Прыдумалі нават лагатып і растлумачылі падрабязна, што ён азначае. Такім чынам была праведзена і краязнаўчая работа.

— Мы пабачылі, што наша моладзь зацікаўлена, каб даведацца і захаваць гісторыю сваіх вёсак. Яны ж дайшлі да кожнай бабулі, якія памятаюць традыцыі населеных пунктаў, распыталі пра мінулае і зрабілі творчае ўвасабленне... Сёння вельмі актуальная для нас тэма — працаўладкаванне грамадзян. Як адзін з кірункаў у гэтай рабоце — праект, які рэалізуецца на тэрыторыі Барсукоўскага сельсавета. Сёлета ў лютым пярвічнай арганізацыяй Гомеля «Беларуская асацыяцыя маладых хрысціянскіх жанчын» была запушчана адукацыйная ініцыятыва «Стварэнне ў Кармянскім раёне Гомельскай вобласці Цэнтра нефармальнай адукацыі» ў межах праекта «Вучыцца, каб дзейнічаць». Ён фінансуецца Еўрапейскім саюзам і суфінансуецца DVV International.

Партнёрамі ў ажыццяўленні ініцыятывы выступаюць Кармянскі раённы Савет дэпутатаў, Кармянскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і Барсукоўскі сельскі Савет дэпутатаў. Мэтай праекта з'яўляецца адаптацыя людзей, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, да патрабаванняў рынку працы і садзейнічанне ім у пераадоленні крызісных сітуацый.

Уцягнуць жыхароў раёна ў занятак мастацкай творчасцю ўжо атрымалася. З мая ў Барсукоўскім сельсавеце прыступілі да навучання мэтавай групы. Яе ўдзельнікі займаюцца не толькі тэарэтычнай падрыхтоўкай, але і практыкай на занятках мастацкай творчасцю. Для іх праводзяцца майстар-класы па пэчворку. Таццяна Валянцінаўна расказвае, што першыя коўдры, зробленыя рукамі мясцовых майстрых, ужо здзівілі прыгажосцю.

— Людзі ж навучаюцца не толькі тэхніцы шыцця з абрэзкаў тканіны, але і атрымліваюць навыкі работы на швейнай машынцы, навучаюцца рамантаваць старыя рэчы. Пэчворк можа стаць не толькі займальным творчым заняткам, але і выгадным — ён не патрабуе вялікіх выдаткаў. Кавалачкі тканін заўсёды можна знайсці дома і зрабіць з іх карысныя рэчы, якія ўяўляюць мастацкую каштоўнасць. Магчыма, для кагосьці гэты занятак у далейшым перарасце ў невялікі бізнес. Сёння ў групе займаюцца і сталыя людзі. Для многіх пры гэтым важныя і стасункі паміж сабой.

Акрамя таго, у межах праекта 30 чалавек будуць навучацца іншым спецыяльнасцям. Пасля анкетавання былі выбраны кірункі, актуальныя для жанчын, напрыклад, майстры па манікюры і педыкюры. Жанчыны будуць навучацца ў Гомелі, каб потым мець магчымасць адкрыць сваю справу, маючы на руках дакумент пра наяўнасць спецыяльнасці. Праект прадоўжыцца да 2020 года.

Важным сродкам выкарыстання грамадскага патэнцыялу насельніцтва і ўладкавання тэрыторый на Кармяншчыне лічаць і правядзенне свят вёсак. Падчас такіх мерапрыемстваў людзі не толькі парадак наводзяць, але і пачынаюць адчуваць гонар за свой населены пункт. Такім чынам з'яўляецца і жаданне зрабіць свой асабісты ўнёсак, каб малая радзіма стала яшчэ лепшай, яшчэ прыгажэйшай.

— Аднак трэба шчыра сказаць, што на ўзроўні мясцовых Саветаў дэпутатаў пярвічнага звяна асобныя праблемы мы вырашаем яшчэ не ў поўнай ступені, а гэта ў выніку прыводзіць да зваротаў у вышэйстаячыя органы ўлады. Таму неабходна ўдасканальваць работу ў гэтым кірунку, у першую чаргу больш выкарыстоўваць патэнцыял дэпутацкага корпуса, органаў мясцовага самакіравання і грамадскіх фарміраванняў, — лічыць Таццяна Шэхцер.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ШТО НАМ ТРЭБА, ВЫЗНАЧАЕМ САМІ

## Як мясцовыя жыхары Краснаярскага краю паляпшаюць умовы свайго жыцця

**У кожнай краіны — свае асаблівасці ў мясцовым самакіраванні. У Беларусі традыцыйна склалася сістэма, калі грамадзяне пэўнай мясцовасці выбіраюць дэпутата, які пасля прадстаўляе іх інтарэсы ў Саветах таго ці іншага ўзроўню. Ці людзі самі аб'ядноўваюцца ў камітэты тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання па месцы жыхарства, каб вырашыць мясцовыя праблемы.**
**У Расіі да гэтага падышлі наступным чынам. Апошнія гады грамадзян заахвочваюць разам з уладамі прымаць рашэнне: якое менавіта пытанне неабходна вырашыць у першую чаргу, на паляпшэнне чаго канкрэтна пойдуць муніцыпальныя грошы і часткова — грошы саміх жыхароў. Так, ужо не першы год дзейнічае адпаведны федэральны праект «Развіццё ініцыятыўнага бюджэтавання ў Расійскай Федэрацыі».**

### Ва ўсёй Расіі так

Ініцыятыўнае бюджэтаванне — гэта рашэнне пытанняў мясцовага значэння, заснаванае на грамадскай ініцыятыве. Падчас яго пры непасрэдным удзеле грамадзян вызначаюцца і выбіраюцца аб'екты расходавання бюджэтных сродкаў, а таксама ажыццяўляецца далейшы кантроль за рэалізацыяй адабраных праектаў.

У Расіі падобныя практыкі, як правіла, звязаныя з рашэннем пытанняў мясцовага значэння. Па стане на канец 2017 года 43 рэгіёны ўдзельнічалі ў развіцці ініцыятыўнага бюджэтавання. Ад рэгіёна да рэгіёна спосаб рэалізацыі можа адрознівацца. Часцей за ўсё маюцца на ўвазе абмеркаванне бюджэтных пытанняў, удзел грамадзян і прадстаўнікоў мясцовай улады, серыйны працэс рэалізацыі, арганізацыя публічнай справаздачнасці.

У большасці рэгіёнаў праекты рэалізуюцца на аснове сумеснага фінансавання з некалькіх крыніц: субсідыі з рэгіянальнага бюджэту, уклад муніцыпальных бюджэтаў, а таксама добраахвотныя ўзносы з боку насельніцтва і бізнесу. І калі ў 2015 годзе ў Расіі было рэалізавана 2657 такіх праектаў, то ў 2016-м — 8732 праекты. Як правіла, праграмы ініцыятыўнага бюджэтавання запускаюцца на рэгіянальным узроўні, але часам муніцыпальныя органы ўлады самі ініцыююць іх старт.

Найбольшы вопыт рэалізацыі праектаў ініцыятыўнага бюджэтавання ў Расіі назапашаны ў рамках такой практыкі, як Праграма падтрымкі мясцовых ініцыятыў (ППМІ), якая была запушчана ў 2007 годзе і ў далейшым рэалізоўвалася пры падтрымцы Сусветнага банка. Абавязковым кампанентам праграмы з'яўляецца суфінансаванне (нязначнае) праектаў з боку грамадзян, якое разглядаецца як спосаб выявіць сапраўды надзённыя праблемы.

Часцей за ўсё грамадзяне падтрымліваюць і суфінансуюць рамонт дарог і арганізацыю водазабеспячэння, рамонт аб'ектаў культурнай інфраструктуры, добраўпарадкаванне тэрыторыі паселішчаў, добраўпарадкаванне месцаў адпачынку і дзіцячых пляцовак, аб'ектаў спартыўнай інфраструктуры, арганізацыю асвятлення, супрацьпажарных мерапрыемстваў, добраўпарадкаванне месцаў пахаванняў.

### Схема дзеяння

— З 2016 года Краснаярскі край таксама далучыўся да ініцыятыўнага бюджэтавання, — паведаміла **Ірына ПАСТУХОВА, першы намеснік міністра фінансаў Краснаярскага краю.**



Так, федэральны праект засноўваецца на пагадненні Сусветнага Банка і Мінфіна Расіі па праекце «Развіццё ініцыятыўнага бюджэтавання (ІБ) у рэгіёнах РФ». Да яго, акрамя Краснаярскага краю, ужо далучыліся Кіраўская, Цвярская, Ніжагарodская вобласці, Стаўрапаль, Хабараўскі край, Рэспубліка Башкартастан і Паўночная Асецыя, Яўрэйская аўтаномная вобласць і інш.

Праграма падтрымкі мясцовых ініцыятыў мае відавочныя асаблівасці. Па-першае, выбар праекта адбываецца на сходзе жыхароў. Вызначаецца прыярытэтная праблема для вырашэння яе ў рамках праекта, зацвярджаецца сума ўкладу жыхароў у яго рэалізацыю, фарміруецца ініцыятыўная група для падрыхтоўкі конкурснай заяўкі. Па-другое, рыхтуецца заяўка для конкурсу. Распрацоўваецца каштарыс праекта, фарміруецца пакет дакументаў для ўдзелу ў конкурсе. Па-трэцяе, заяўка або перамагае ў конкурсе, або не. Праводзіцца рэгіянальны конкурс і выбар праектаў-пераможцаў, збор фінансавага ўкладу ўсіх удзельнікаў праекта, які перамог, пералічваюцца грашовыя сродкі ў мясцовы бюджэт.

Далей — будаўнічыя работы, г. зн. непасрэдная рэалізацыя праекта. Адбор падрадчыкаў (правядзенне конкурсу), заключэнне кантрактаў, выкананне работ, забеспячэнне нефінансавага ўкладу жыхароў, маніторынг рэалізацыі праекта, кантроль за выкананнем ходу работ. І нарэшце, самае прыемнае — урачыстае адкрыццё аб'екта, падвядзенне вынікаў рэалізацыі праекта ў муніцыпальным утварэнні, публікацыя вынікаў рэалізацыі праекта.

Адной з асаблівасцяў праграмы ў Краснаярскім краі з'яўляецца тое, што грамадзяне могуць укласціся ў праект не толькі грашыма, але і матэрыяламі. Напрыклад, будаўнічымі. Таксама ўдзел могуць браць і часта робяць гэта суб'екты малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

Але асноўная частка сродкаў паступае з мясцовага бюджэту: 85 % з краявога, 5 % — муніцыпальнага, 3 % — сродкі грамадзян, 7 % — без прывязкі да крыніцы фінансавання. «У сярэднім складачны капітал з грамадзян — па 300 рублёў з чалавека», — расказвае Ірына Пастухова. Гэта каля 10 беларускіх рублёў. «Пагадзіцеся, грошы невялікія, і таму людзі іх досыць ахвотна аддаюць», — дзеліцца першы намеснік міністра.

### Ад Дома культуры да водаправода

Пры гэтым адносна невялікія грашовыя ўкладанні з чалавека цягнуць за сабой прыемныя наступствы. Напрыклад, людзі пачынаюць сачыць не толькі за ходам работ, але і за тым, каб адрамантаваныя аб'екты не зруйнавалі, каб іх не пашкодзілі. Таксама адзін са станоўчых эфектаў — рост узроўню даверу жыхароў да прадстаўнікоў улады. Па апытаннях Сусветнага банка, тыя, хто ўзяў удзел у ініцыятыўным бюджэтаванні, пачынаюць больш давяраць розным узроўням улады.

Па словах Ірыны Пастуховай, далучыцца да праграмы хочуць муніцыпалітэты не толькі Краснаярскага краю, але і іншых. Людзі бачаць, як мяняюцца да лепшага гарады і вёскі, якія задзейнічаны ў праграме, і таксама праяўляюць ініцыятыву па змяненні чагосьці ў сваім паселішчы. Бо самае прывабнае ў тым, што не кіраўнік муніцыпалітэта, а менавіта сход жыхароў вырашае, на што ў першую чаргу выдаткоўваць грошы.

Прытым праекты могуць быць самымі разнапланавымі. За мінулы год па праграме быў рэалізаваны 51 праект: абсталявана 16 дзіцячых ці спартыўных пляцовак, зроблена 12 рамонтаў палацаў культуры, праведзена сем



Было...



...стала.

добраўпарадкаванняў могілак, а таксама праекты датычыліся рамонту вулічнага асвятлення, водаправода, пажарнага паста і паляпшэння тэрыторыі сельсаветаў. «Так мы спрабуем заахвоціць людзей удзельнічаць у самакіраванні, разам з мясцовымі ўладамі накіроўваць свае сілы на тое, каб палепшыць жыццё ў населеных пунктах», — рэзюмавала Ірына Пастухова.

**Вераніка ПУСТАВІТ,**
*г. Краснаярск.*


**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Государственному предприятию «БелПСХАГИ»**

| № Лота | Описание | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Грузопассажирский вагон UAZ 39099, кузов (рама) XTT39099050446461 / 37410050467679, 2005 г.в., 6 пас. мест. Двигатель – бензин, 2,7 л. Пробег – 209 382 км | 1 494,75 | 150,00 |
| Лот № 2 | Грузопассажирский вагон UAZ 39099 4, кузов (рама) №XTT39099480449720 / 37410080471012, 2008 г.в., 6 пас. мест. Двигатель – бензин, 2,7 л. Пробег – 329 981 км | 2 140,42 | 215,00 |
| Лот № 3 | Легковой специальный вагон WOLKSWAGEN MULTIVAN, кузов (рама) WV2ZZZ70ZSH034798, 1995 г.в. Особые отметки - ИЗЫСКАТЕЛЬСКАЯ. Двигатель – дизель, 2,5 л. Пробег – 606 826 км | 1 747,26 | 175,00 |

**Местонахождение Лотов:** Минский р-н, Сеницкий с/с, аг. Прилуки, ул. Мира, дом №1а. **Шаг аукциона – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект(-ы) по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) – Претендент на покупку, должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта(-ов) в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения открытого аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить Объект(-ы) в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания договора купли-продажи.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 01.08.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

**Продавец:** государственное предприятие «БелПСХАГИ», 223011, Минский район, аг. Прилуки, ул. Мира, дом 1а, т. 8 (017) 509-24-18.

**Организатор аукциона:** РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, т. 8 (017) 306-00-57.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот №___), принадлежащего государственному предприятию «БелПСХАГИ», проводимом 1 августа 2018 г. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Организатор аукциона имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до наступления даты его проведения.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. **Окончание приема заявлений 30.07.2018 в 11.00.**

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами. Контактное лицо для осмотра Объектов – Десюкевич Анатолий Владимирович, тел.: 8(017)5092761, 8(029)7448252.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



Утерянный представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска полис по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 2199051 **считать недействительным.**
УНП 100122726



**Открытое акционерное общество «Управление механизации № 79» извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, проводимых на электронной торговой площадке «ТОРГИБЕЛ»**

| № Лота | Описание предмета электронных торгов | Начальная цена с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 260618001 | Башенный кран КБ-408 (заводской № 243, год выпуска 1989) | 48 620,00 | 4 900,00 |
| 260618002 | Башенный кран КБ-408 (заводской № 8, год выпуска 1989) | 48 620,00 | 4 900,00 |

**Местонахождение предметов торгов:** г. Минск, ул. Селицкого, 27А. **Шаг электронных торгов – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Предмета (Предметов) электронных торгов по истечении 10 (десяти) банковских дней с момента определения Победителя электронных торгов (Претендента на покупку).
2. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) должен оплатить Продавцу стоимость, приобретенного на электронных торгах Предмета (Предметов) электронных торгов в течение 10 (десяти) банковских дней после подписания договора купли-продажи.
3. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору электронных торгов стоимость затрат на организацию и проведение электронных торгов на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя электронных торгов.
5. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) – нерезидент Республики Беларусь оплачивает стоимость приобретенного на электронных торгах предмета электронных торгов в российских рублях, долларах США (по соглашению сторон) по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату, оговоренную в договоре купли-продажи. Ставка налога на добавленную стоимость при продаже предметов электронных торгов нерезиденту Республики Беларусь (экспорт) в соответствии с Налоговым Кодексом Республики Беларусь устанавливается в размере ноль (0) процентов.

**Дата и время начала проведения электронных торгов 31 июля 2018 года с 13.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»)**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом ЭТП «ТОРГИБЕЛ» с соблюдением требований Положения о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков», утвержденных постановлением Совета Министров РБ № 608 от 12 июля 2013 г.

**Продавец:** ОАО «УМ № 79», 220075, г. Минск, ул. Селицкого, 27А, тел./факс (+375 17) 344-10-20, (+375 29) 179-06-36.

**Организатор электронных торгов:** ОАО «УМ № 79», 220075, г. Минск, ул. Селицкого, 27А, тел./факс (+375 17) 344-10-20, (+375 29) 179-06-36.

**Оператор электронной торговой площадки:** РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 8 (017) 306-00-57.

**Электронный адрес ЭТП:** http://торги.бел.

Задаток перечисляется на р/с BY68BPSB30121543370789330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в электронных торгах по продаже имущества, принадлежащего ОАО «УМ № 79» (Лот № _________), проводимых 31 июля 2018 г. Перечисление задатка производится не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах – 26.07.2018 г. Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов.

Аккредитация, регистрация и участие в электронных торгах осуществляется на ЭТП «ТОРГИБЕЛ».

**Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами: 26.07.2018 г. в 11.00.**

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Предметами. Контактное лицо для осмотра Предметов электронных торгов – Щуцкий Алексей Александрович, +375 (29) 179-06-36. Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «ТОРГИБЕЛ» (http://торги.бел.)

# НЕ САМ САБЕ РЭЖЫСЁР

## Хто сочыць за добраўпарадкаваннем прыватнага сектара

**УСЕ мы не раз чулі выраз «мой дом — мая крэпасць». Прычым многія ўспрымаюць значэнне гэтай фразы занадта літаральна: маўляў, раз крэпасць, значыць, на сваёй тэрыторыі я магу рабіць абсалютна ўсё, што душа пажадае. Але ж мы жывём у цывілізаваным грамадстве, у якім існуюць нормы, у тым ліку і добраўпарадкавання прыватных участкаў. Як аказалася, іх даволі шмат. Пра тое, якія правілы трэба выконваць, калі вам пашчасціла жыць у сваім доміку ў сталіцы, мы даведаліся падчас штотыднёвага аб'езду тэрыторый з камунальнымі службамі.**

### Камень спатыкнення

На тэрыторыі Заводскага раёна горада Мінска размешчана 3620 прыватных домаўладанняў. Досыць вялікая лічба, улічваючы, што нямала дамоў было знесена за апошнія гады. Уплывае на добраўпарадкаванне раёна і новы генеральны план, праўда, калі раней тэрмінам зносу называлі 2020 год, то зараз яго адсоўваюць да 2023-га. Гэта істотна ўскладняе ўзаемадзеянне з мясцовымі жыхарамі. Яны ўжо даўно «сядзяць на чамаданах», таму асабліва акультурваць дамы, якія ўсё роўна пойдуць пад знос, не імкнуцца. У той час як нормы добраўпарадкавання для ўсіх аднолькавыя.

Сёння ў плане ў камісіі, якая складаецца з прадстаўнікоў аддзела гарадской гаспадаркі раённай адміністрацыі, аддзела па прыватных домаўладаннях ЖРЭА, санстанцыі і пажарнай службы, аб'езд Малога Трасцянка. Раней тут была вёска, тэрыторыя ўвайшла ў склад Мінска толькі ў 80-х. Мікраraён знаходзіцца ўбаку ад транспартных артэрый — вуліцы, размешчаныя ўздоўж іх, спецыялісты называюць каркаснымі, аднак патрабаванні да мясцовых жыхароў ад гэтага не менш строгія. Па словах **начальніка аддзела па прыватных домаўладаннях ДУП «Жыллёвае рамонтна–эксплуатацыйнае аб'яднанне Заводскага раёна г. Мінска» Жанны ТУМІЛОВІЧ**, часцей за ўсё ўзнікаюць пытанні, звязаныя з афарбоўкай і заменай агароджаў, рамонтам і афарбоўкай фасадаў дамоў, самавольным будаўніцтвам або парушэннем праектнай дакументацыі, у сезон — з пакосам травы. І калі па вышыні агароджы або памерах і размяшчэнні пабудоў ёсць выразныя нормы, то недагледжанасць вызначаецца амаль інстынктыўна: гэта калі эстэтычны складнік дакладна можна назваць парушаным. Даводзіцца змагацца камунальным службам і з «сіндромам Плюшкіна», калі ўчастак захламляюць настолькі, што гэта можа ўяўляць небяспеку. А вось тэндэнцыю спальвання смецця ўжо практычна ўдалося перамагчы: гараджане нарэшце зразумелі, што на маленькіх участках гэта недапушчальна. Адзін «трэнд» застаецца нязменным: бясконцыя спрэчкі паміж саўладальнікамі дамоў, а таксама паміж гаспадарамі сумежных участкаў. Прычым да вырашэння спрэчных пытанняў мінчане спрабуюць заклікаць гарадскія службы, хоць большасць з іх павінна абмяркоўвацца проста падчас спакойнай асабістай гутаркі.

### Свая праўда

Каля аднаго з такіх дамоў мы і праязджаем. Сутнасць спрэчкі: адзін саўладальнік не дае другому дазволу на рэканструкцыю, у выніку знешні выгляд дома вымушае жадаць лепшага. Сітуацыя нават дайшла да суда, але «працаўнік» у залу так і не з'явіўся... Яшчэ адзін выпадак. У двары размешчаны аб'ект самавольнага будаўніцтва: гараж узвялі ў 1986 годзе. Хацелі тады ж зарэгістраваць, але саўладальнік участка не даў згоды. Зараз гэтая праблема вырашылася, але ёсць іншая: адлегласць ад сцяны збудавання да суседняга



> Тым, хто спрабуе абараніць сваю праўду, грунтуючыся толькі на ўласнай упартасці, варта пашкадаваць нервы: так ці інакш парушэнні ўсё роўна будуць ліквідаваныя.

ўчастка меншая за метр. Тут два варыянты развіцця падзей: альбо сусед пацвердзіць, што ён не пярэчыць, альбо гараж пойдзе пад знос. І, мяркуючы па ўсім, чакаецца менавіта другі варыянт.

Але і тут не ўсё проста. Камунальнікі выпісваюць прадпісанне, і ўладальнік можа альбо сам разабраць збудаванне (з бонусаў — захаваны будаўнічы матэрыял), альбо гэта зробіць служба, але з пакрыццём выдаткаў за кошт гаспадара. Праўда, загваздка ў тым, што на прыватную тэрыторыю, калі няма пагрозы жыцця, староннія могуць трапіць толькі з дазволу. У падобнай сітуацыі адзін мінчанін тры гады не дапускаў спецыялістаў да сябе ў двор, справа вырашылася праз суд — будынак знесены. Так што тым, хто спрабуе абараніць сваю праўду, грунтуючыся толькі на ўласнай упартасці, варта пашкадаваць нервы: так ці інакш парушэнні ўсё роўна будуць ліквідаваныя.

Але не варта думаць, што гарадскія службы не ідуць мясцовым жыхарам насустрач. У кожным асобна ўзятым выпадку ўлічваюцца ўсе жыццёвыя абставіны. Тэрмін дзеяння прадпісання залежыць ад тыпу работ. Напрыклад, на афарбоўку фасада або замену агароджы даецца ў сярэднім 2-3 месяцы. А калі людзі кажуць, што змогуць прыступіць да работ падчас адпачынку ці збіраюць сродкі на сайдынг, таму пакуль не фарбуюць дом, тэрмін працягваецца.

— Наша мэта не караць, а прывучыць да адказнасці за ўласнае месца жыхарства, — кажа Жанна Туміловіч.

### «Я мастак, я так бачу»

Безгаспадарных дамоў на тэрыторыі раёна цяпер няма, а вось участкі, якія ніхто не дагледае, на жаль, ёсць. Але ў хуткім часе Указ Прэзідэнта № 100 аб старых і пустуючых дамах распаўсюдзіць сваё дзеянне на горад Мінск. Тады будзе складзены рэестр такіх дамоў — большасць з іх, як правіла, засталіся пакінутымі пасля пажару — і прынята рашэнне, як далей з імі быць. Таму што ўгаворы спрацоўваюць не заўсёды.

Наогул тое, наколькі добра спецыялісты ведаюць мясцовых жыхароў, прыемна здзіўляе. Пакуль мы праязджаем па вуліцах, яны паміж сабой абмяркоўваюць, хто сёлета якія работы пачаў на ўчастку і як выконваюцца загады, дэманструючы веданне «гісторыі» літаральна кожнага дома. Вы ведалі, напрыклад, што трэба ўзгадняць са службамі абсалютна ўсе пабудовы? Выключэнне складаюць толькі некапітальныя збудаванні, якія не маюць прывязкі да зямлі. Гэта значыць, калі вы хочаце купіць гатовую альтанку ў краме — калі ласка, а вось калі плануеце ўзвесці яе на падмурку самастойна — будзьце ласкавыя, звярнуцца па дазвол.

Дызайн і расфарбоўку агароджы, як і колер фарбы для фасада дома, таксама трэба ўзгадняць. У ідэале вуліца павінна выглядаць як адзіная архітэктурна выверанная кампазіцыя, але на справе гэта магчыма толькі тады, калі будаўніцтва ўсіх дамоў пачнецца адначасова. Як доказ гэтай тэорыі — ярка-лімонны дом, які вылучаецца на фоне значна больш стрыманых суседскіх пабудоў. «Тут у нас жыве гаспадар — творчая асоба. Паглядзіце, як шмат у двары розных упрыгажэнняў. І яму не дакажаш, што колер зусім не ўпісваецца ў навакольнае асяроддзе. Адказ адзін — я мастак, я так бачу», — усміхаецца Жанна Туміловіч.

Акрамя таго, спецыяліст падкрэслівае, што тым, хто яшчэ толькі задумваецца аб куплі жылля ў прыватным сектары, варта ведаць: рамонтныя работы тут прыйдзецца праводзіць штогод, такая спецыфіка. Затое ў адрозненне ад кватэры ў шматпавярховіку свой дом у большай ступені зможа адпавядаць патрэбам і сямейнага гнязда, і сапраўднай крэпасці...

**Дар'я КАСКО.**


**ООО «Центр Белинвентаризация»**
г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

✓ Раздел и установление порядка пользования земельным участком
✓ Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения
✓ Пересчет долей в связи с изменением капитального строения

**Извещает о проведении аукциона по продаже имущества**
**Коммунального топографо-геодезического унитарного предприятия «Гомельгеодезцентр», 8 (0232) 41 97 17**

| № лота | Наименование объекта | Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | – Автомобиль (грузопассажирский фургон) УАЗ 390994, гос. номер АВ 2358-3, 2007 года выпуска, темно-зеленый цвет, находящийся по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149 | 3 960,00 | 396,00 |

| | |
|---|---|
| Срок подачи заявления | По 30 июля 2018 г. в рабочие дни с 9⁰⁰ до 16⁰⁰ от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| Дата, время и место проведения аукциона | 31 июля 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с BY71BPSB30121783390109330000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 29.06.2018 г. |
| Условия продажи | Объект продается в собственность. Шаг аукционных торгов – 5 %. Заключить договор купли-продажи в течение 5 (пяти) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Стоимость лота, сформированная на аукционе, должна быть выплачена Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) Продавцу в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания договора купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. |

**Для участия в аукционе необходимо предоставить:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ООО «Центр Белинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
8. Участник аукциона, выигравший торги, либо лицо, признанное покупателем, оплачивает стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов – Организатору аукционных торгов.
9. Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ООО «Центр Белинвентаризация».

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45**



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ — газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых саветаў

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 28 чэрвеня 2018 года.**